
Работніца і Калгасьніца
Беларусі
№ 5 (150)

Аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспад. умацаваньні калгасаў

(Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага 1932 г.)

ЦК партыі ўказвае ўсім партыйным арганізацыям на тое, што задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца ў цяперашні час перш за ўсё задачай разьвіцьця і ўмацаваньня **арцельнай** формы калгасаў. Пры гэтым ЦК зыходзіць з таго, што спробы штучнага паскарэньня пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на цяперашняй стадыі разьвіцьця калгасаў зьяўляюцца сур'ёзнай **небясьпекай**. Супроць гэтай небясьпекі **пераскокваньня** праз форму сельска-гаспадарчай арцелі, якая яшчэ не разгорнута выстарчальна і не замацавана, ЦК папярэджвае ўсе партыйныя арганізацыі.

У сувязі з падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі і барацьбой за павышэньне ўраджайнасьці, ЦК асабліва падкрэсьлівае наступныя чарговыя задачы ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у іх арцельнай форме, якая зьяўляецца на данай стадыі **пануючай**:

1. Важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць **брыгада**. У адпаведнасьці з вопытам лепшых сельска-гаспадарчых арцеляй, ЦК лічыць мэтазгодным арганізацыю ў калгасах брыгад з пастаянным складам калгасьнікаў з тым, каб, як правіла, такія брыгады рабілі ўсе асноўныя сельска-гаспадарчыя работы на працягу ўсяго году на пэўных вучастках. Гэтым брыгадам калгас вылучае на час работы неабходныя машыны, інвэнтар і рабочую жывёлу, за стан якіх цалкам адказвае брыгада. Ацэнка працадня калгасьнікаў павінна павышацца або паніжацца, у залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады.

Стварэньне такіх брыгад не павінна, аднак, выключаць магчымасьці замацаваньня за брыгадамі вучасткаў (у залежнасьці ад мясцовых умоў, разьмераў калгасу, яго арнізаванасьці) не на ўвесь сельска-гаспадарчы сэзон, а толькі на асобны пэрыяд сельска-гаспадарчых работ (ворыва, уборка).

2. Падбор брыгадзіраў, зьнішчэньне цякучасьці іх складу і сапраўдная дапамога брыгадзірам у справе павышэньня іх гаспадарчай і палітычнай кваліфікацыі—павінны стаць важнейшай задачай партыйных арганізацый.

Шырокае распаўсюджаньне павінна атрымаць ужо ўжываная ў мінулым годзе ў лепшых калгасах практыка аплаты працы брыгадзіраў у залежнасьці ад канчатковых рэзультатаў работы брыгады.

Павышэньне адказнасьці брыгадзіра, перадача яму раду функцый у справе арганізацыі працы ў калгасах павінны суправаджацца скарачэньнем агульна-адміністрацыйных расходаў у калгасе, якія ў радзе выпадкаў недапушчальна разбухлі.

3. Ажыцьцяўленьне на справе пастаноў VI зьезду Саветаў аб укараненьні **зьдзельшчыны**, паляпшэньні ўліку і аб ацэнцы працы кожнага калгасьніка ў працаднях, у залежнасьці ад колькасьці і якасьці зробленай ім работы, застаецца важнейшай задачай.

У той-жа час ЦК **папярэджвае** ад надмернага ўскладненьня форм зьдзельшчыны, увядзеньня прагрэсыўнай зьдзельшчыны, захапленьня індывідуальнымі формамі зьдзельшчыны там, дзе гэта не выклікаецца ўмовамі вытворчасьці (напр., на ворыве, малацьбе), супроць спробаў перавесьці аплату працы калгасьнікаў на грашовую зарплату, супроць падмены работы праўленьняў калгасаў голым адміністраваньнем з боку партыйных і савецкіх арганізацый, супроць перавышэньня прынятых у статуце сельска-гаспадарчай арцелі разьмераў адлічэньняў у розныя фонды.

4. Шырокае распаўсюджаньне павінна атрымаць праверапая на вопыце лепшых жывёлагадоўчых калгасных фэрм практыка абслугоўваньня працуючымі ў брыгадзе калгасьнікамі пэўнай групы жывёлы з тым, каб **жывёлагадоўчая брыгада** і калгасьнікі, якія ў яе ўваходзяць, аплачваліся ў залежнасьці ад рэзультатаў іх работы (колькасьць выдаенага малака, прырост вагі маладняка, разьмер прыплоду і г. д.).

5. ЦК лічыць важнейшай палітычнай задачай партыйных і калгасных арганізацый работу па вылучэньні і выхаваньні калгаснага актыву з ўдарнікаў-калгасьнікаў, удзельнікаў сацспаборніцтва, брыгадзіраў і г. д. На калгасны актыў павінны апірацца мясцовыя арганізацыі пры ажыцьцяўленьні важнейшых гаспадарчых мерапрыемстваў — барацьбы за ўраджай, за выкананьне пляну збожжазагатовак і г. д., а таксама ў справе сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў.

6. Ва ўсёй рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, стварэньні калгаснага актыву і павышэньні ўраджайнасьці—асабліва вялікая роля і адказнасьць **машына-трактарных станцый**. У сувязі з гэтым ЦК прапануе партыйным арганізацыям узмацніць штодзенную дапамогу машына-трактарным станцыям, у асаблівасьці ў справе ўмацаваньня кадраў і ўзмацніць кіраўніцтва ўсёй гаспадарчай работай МТС.

ЦК УсеКП(б).

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Работніца і Калгасьніца Беларусі

ЛЮТЫ 1932 год — 8-мы год выданьня — № 5 (150)

„Канфэрэнцыя лічыць, што асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія нараджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, і перамаганьне пережыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельціцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва“. (З рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі па дакладу тт. Молатава і Куйбышава).

Наперад, да другой пяцігодкі пабудовы сацыялізму!

Скончылася XVII партыйная канфэрэнцыя.

Канфэрэнцыя прыняла важнейшыя пастановы аб рабоце прамысловасьці ў апошнім, завяршальным годзе першай пяцігодкі і аб пляне другой пяцігодкі. Пастановы канфэрэнцыі зацьверджаны пленумам ЦК.

6 год назад на XIV партыйным зьезьдзе **т. Сталін высунуў лёзунг сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны**, якая толькі што выйшла з адбудоўчага пэрыяду. Пастановы XIV зьезду прымаліся і потым праводзіліся ў жыцьцё ў жорсткай барацьбе з зіноўеўскай апазыцыяй, а потым трацкісцка-зіноўеўскім апазыцыйным блёкам, якія, прыкрываючыся „левай“ фразай, на справе капітулявалі перад труднасьцямі пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

XV зьезд канстатаваў падрабязныя посьпехі палітыкі індустрыялізацыі, і XVI канфэрэнцыя рубам паставіла пытаньне аб тэмпах сацыялістычнай індустрыялізацыі, аб такіх тэмпах, якія давалі б нам магчымасьць дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. XV зьезд завастрыў увагу партыі на разьвіцьці цяжкай індустрыі ў першую чаргу, як асновы і базы сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. XV зьезд паставіў перад партыяй і другую важнейшую задачу—сацыялістычнай рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі, пераходу ад дробнай і драбнейшай сялянскай гаспадаркі да буйнага аграмаджанага земляробства. XV зьезд выключыў з партыі трацкісцка-зіноўеўскую апазыцыю, якая імкнулася сарваць тэмпы будаўніцтва сацыялізму.

Правядзеньне ў жыцьцё пастаноў зьезду аб бальшавіцкіх тэмпах індустрыялізацыі, аб разьвіцьці цяжкай індустрыі ў першую чаргу, аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, шырокім будаўніцтве саўгасаў і калгасаў і ўзмацненьні наступленьня на кулака патрапіла на жорсткае супраціўленьне правай апазыцыі, якая аформілася, як агентура кулака ўнутры партыі, і фактычна проціпаставіла шляху сацыялістычнай рэканструкцыі, намечанаму партыяй, шлях капіталістычнай рэстаўрацыі. У момант самай жорсткай і абвостранай барацьбы з правай апазыцыяй, партыя на XVI партыйнай канфэрэнцыі, на аснове пастаноў XV зьезду, прыняла плян першай пяцігодкі. **XVI зьезд увойдзе ў гісторыю нашай партыі, як зьезд сацыялістычнага наступленьня, як зьезд суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, як першы зьезд пэрыяду сацыялізму, у які ўступіла савецкая краіна, як зьезд поўнага ідэйнага выкрыцьця і разгрому правага апартунізму, погляды якога зьезд прызнаў несумяшчальнымі з прыналежнасьцю да партыі.**

Праўда, пасьля зьезду супроць партыі стварыўся новы апартуністычны блёк з асколкаў правага апартунізму і трацкісцкага прыхвосьця—так званы права-„левацкі“ блёк. Характэрнымі асаблівасьцямі блёку былі бяспрынцыпная, двурушніцкая і праваапартуністычная пляцформа. Адкінуўшы прэч з дарогі кучку абанкрутаваных капітулянтаў, праводзячы далей непрымірымую барацьбу на два фронты, супроць правага і „левага“ апартунізму і супроць прымірэнцтва, партыя падышла да XVII партканфэрэнцыі з новымі вялізарнымі посьпехамі, якія забясьпечваюць ажыцьцяўленьне асноўных лёзунгаў XVI партыйнага зьезду аб выкананьні пяцігодкі за чатыры гады і аб суцэльнай калектывізацыі ўсяго Савецкага Саюзу.

Пабудован фундамант сацыялістычнай эканомікі. Магутнае разьвіцьцё цяжкай індустрыі, асабліва машына-будаўніцтва, ужо стварыла базу для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Пасьля ўпартай, напружанай барацьбы партыя дабілася пералому на рашаючых вучастках прамысловасьці, адставаньне якіх мацней за ўсё адбівалася на выкананьні пляну пяцігодкі, на вучастках вугалю і мэталю.

Дасягнуты рашаючыя посьпехі ў аўладаньні тэхнікай важнейшых вытворчасьцяй, якія вызваляюць нас ад замежнай залежнасьці.

Дасягнутыя рашаючыя посьпехі ў барацьбе за аздараўленьне чыгуначнага транспарту, які зьяўляецца зараз найбольш вузкім месцам нашай народнай гаспадаркі. Дасягнута паскарэньне разьвіцьця лёгкай індустрый.

Разгортваецца савецкі гандаль, **паляпшаецца матар'яльнае становішча шырокіх рабочых і працоўных мас.** Суцэльная калектывізацыя і ліквi-

дацыя кулацтва праведзены ў асноўным у рашаючых збожжавых раёнах нашай краіны. **Усіх гэтых посьпехаў партыя дабілася на аснове барацьбы з апартунізмам і на аснове канкрэтнага бальшавіцкага кіраўніцтва ЦК на чале з тав. Сталіным.**

Пастановы XVII канфэрэнцыі намячаюць для прамысловасьці баявую праграму на чацьверты, апошні год пяцігодкі і даюць асноўныя дырэктывы для складаньня пляну другой пяцігодкі — **пяцігодкі пабудовы сацыялізму.** Намечаны вехі далейшага пераможнага шляху разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Пастаўлена практычная задача ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў, клясаў наогул, пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Шлях да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ляжыць праз жорсткую клясавую барацьбу, праз далейшае ўмацаваньне дзяржавы пралетарскай дыктатуры, праз далейшае ўмацаваньне ленінскай партыі.

Супроць нас—перш за ўсё міжнародная буржуазія. Супроць нас разгромленае, але яшчэ не ліквідаванае кулацтва, якое аказвае і будзе аказваць распачлівае супраціўленьне. Задача сацыялістычнага перавыхаваньня калгасных мас, задача выхаваньня адсталых пластоў пралетарыяту, новых кадраў рабочых стаіць перад намі з усёй вострасьцю.

Нарэшце, супроць нас—апартунізм розных масьцей, які бесьперапынна жывіцца і падтрымліваецца супраціўленьнем клясавага ворага, прабуе яшчэ тармазіць наш рух наперад. Супраціўленьне клясавага ворага—гэта перш за ўсё супраціўленьне кулацтва. Правы апартунізм у партыі—адлюстраваньне кулацкага супраціўленьня ў краіне. **Правы апартунізм унутры партыі застаецца галоўнай небясьпекай на сучасным этапе.** І ўмовай пераможнага перамаганьня правага апартунізму паранейшаму зьяўляецца самая рашучая барацьба з „левымі“ настроямі, „левымі“ загібамі, „лявацкім“ пражэкцёрствам, галавакружэньнем ад посьпехаў, якія дапамагаюць праваму апартунізму і кулаку, што стаіць за яго сьпіной. Гнілы лібэралізм, аб якім пісаў тав. Сталін у рэдакцыю „Пролетарской революции“, праяўляецца ў прымірэнчых адносінах да клясавага ворага (у прыватнасьці да контр-рэвалюцыйнага трацкізму) і да апартунізму, у нежаданьні змагацца з імі ці на глебе стомленасьці, ці на глебе страты клясавай пільнасьці, ці на глебе простага падначаленьня асобных членаў партыі ўплыву клясава чуждой ідэалёгіі.

„XVII партканфэрэнцыя УсеКП(б) лічыць, што асноўнай і рашаючай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца завяршэньне рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, стварэньне навейшай тэхнічнай базы для ўсіх галін народнай гаспадаркі.

Вядучая роля ў завяршэньні тэхнічнай рэканструкцыі належыць савецкаму машынабудаўніцтву. Канфэрэнцыя лічыць неабходным павялічыць прадукцыю машынабудаўніцтва да канца пяцігодкі ня менш чым у тры—тры з паловай разы супроць 1932 году“. (З рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі па дакладу т. т. Молатава і Куйбышава).

Неаслабны агонь па апартунізьме і гнілым лібэралізьме на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва—гэта неабходнейшая ўмова далейшых перамог нашага сацыялістычнага наступленьня, далейшага ўмацаваньня незалежнасьці і абараназдольнасьці нашай краіны, выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, заваяваньня подступаў да другой пяцігодкі, завяршэньня ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі, пасьпяховага вырашэньня вялізарных задач другой пяцігодкі, намечаных XVII партыйнай канфэрэнцыяй.

Праз выкананьне праграмы чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным, **наперад, да другой пяцігодкі пабудовы сацыялізму.**

(„ПРАВДА“).

„Канфэрэнцыя лічыць бязумоўна неабходным дабіцца ў 1937 годзе выпрабу электраэнэргіі ня менш 100 мільярдаў квт.-гадзін супроць 17 мільярдаў у 1932 годзе, здабычы вугалю ня менш, чым у 250 мільёнаў тон супроць 90 мільёнаў у 1932 годзе і павялічэньня здабычы нафты ў 2 з паловай—3 разы“.

(З рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі па дакладу т.т. Молатава і Куйбышава).

Да 8-га сакавіка падрыхтуем лепшых ударніц-работніц і калгасьніц у партыю Леніна.

Арганізуем глыбокае вывучэньне пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

ДА XIV ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Надыходзіць XIV гадавіна Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Дзякуючы посьпехам першай пяцігодкі, дасягнутым на аснове правядзеньня генэральнай лініі партыі, шпаркага росту індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны, значна ўзмацнілася абароназдольнасьць нашага Саюзу і баяздольнасьць Чырвонай арміі.

Чырвоная армія атрымала новага байца — калгасьніка. Значна выросла партыйна-камсамольская частка. Новая тэхніка значна павысіла баяздольнасьць і баягатоўнасьць Чырвонай арміі.

Палітычныя лёзунгі да XIV гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі цалкам вызначаюцца сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва і міжнародным становішчам Савецкага Саюзу.

Задачы Чырвонай арміі, далейшае яе разьвіцьцё вызначаецца гістарычнымі посьпехамі сацыялістычнага наступленьня, тым, што з посьпехам пабудаван фундамант сацыялістычнай эканомікі—і краіна ўступіла ў апошні год першай пяцігодкі. Чырвоная армія павінна забясьпечыць высокае ўдасканаленьне свае́й баявой падрыхтаванасьці, бо тэрмін перадышкі зьмяншаецца з кожным годам і небясьпека новых інтэрвэнцый нарастае. Гэта асабліва відавочна ў сучасных умовах паглыбленьня сусьветнага эканамічнага крызісу, з якога імпэрыялісты шукаюць выхаду ў новых войнах, у вырашэньні сваіх супярэчнасьцяў за кошт СССР, шляхам новай вайны, узброенай інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў.

Захоп японскім імпэрыялізмам Манчжурыі найбольш яскравы прыклад нябывалага абвастрэньня супярэчнасьцяў імпэрыялізму. У шырокай кампаніі, якая праводзіцца да XIV гадавіны Чырвонай арміі, неабходна асьвятліць выключную ролю працоўных жанчын, працуючых у справе абароназдольнасьці краіны. У гераічным мінулым Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі мы маем рад герояў-жанчын камандзіраў, камісараў, байцоў, якія абараняюць краіну Саветаў ад унутранай і міжнароднай контр-рэвалюцыі. Ва ўмовах будучых войн, дзе ня будзе розьніцы паміж фронтам і тылам, удзел жанчын зьяўляецца аднэй з неабходных умоў перамогі.

Наркамваенмор—Варашылаў.

Зараз перад кожнай працоўнай жанчынай і работніцай стаіць задача—быць узброенай вайсковымі ведамі для будучай барацьбы. Задача ўсёй работы Асоавіяхіму павінна стаць — 100-проц. уцягненьне жанчын у работу Асоавіяхіму, арганізацыя курсаў і гурткоў па вывучэньні вайсковай справы і тэхнікі. Умець абыходзіцца з вінтоўкай, кулямётам, працівагазам. Ведаць сродкі абароны ад паветранага нападу працiўніка, умець аказаць першую дапамогу параненаму.

Шырокім ахопам ваеннай падрыхтоўкі ўсіх працоўных жанчын-работніц і сялянак узмацненьнем клопатаў аб Чырвонай арміі—адкажам на пагрозу новай бойкі.

Ажажам усямерную дапамогу ў забясьпечаньні баявой падрыхтоўкі Чырвонай арміі.

Дудко.

Павышэньнем прадукцыйнасьці працы на ўсіх вучастках змаганьня за праграму заключнага году першай пяцігодкі, арганізацыяй сыстэматычнай пляновай работы па ваенізацыі працоўных мас, яшчэ большым узмацненьнем сувязі з вайсковымі часьцямі—спаткаем XIV гадавіну нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Ручная пераноска параненага

МАЦУЕМ НАШУ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ

Манэўры СПА, якія праходзілі па Беларусі месяцаў тры назад, паказалі, што рабочы калектыў абутковай фабрыкі здольны ў любы момант даць належны адпор ворагу і абараніць фабрыку.

У часе трывог рабочыя зьяўляліся на 95 проц. У часе манэўраў шырока разгарнулася сацспаборніцтва сярод каманд, быў

Атрад Асоавіяхіму ф-кі імя Крупскай. Менск.

такі пад'ём рабочых, што ўзьнялася вытворчая і грамадзкая работа ўсіх арганізацый фабрыкі. Мы мелі ўступленьне ў партыю 50 чалавек, у камсамол—34. Падпіска на пазыку „3-ці рашаючы" дадаткова дасягнула 12.000 руб. На фабрыцы ў той час было такое ўражаньне, што кожны рабочы стаяў напагатове, каб у патрэбны момант выступаць на абарону Савецкага Саюзу.

Увесь уздым рабочых мас, партарганізацыя фабрыкі і камсамол, які ў часе манэўраў паказаў сябе верным памочнікам партыі, накіравалі на ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну і паляпшэньне якасьці прадукцыі. Група моладзі машыннага цэху зьнізіла брак з 50 проц. да 20 і выканала прамфінплян на 100 проц. Значна падцягнуліся і другія групы.

Ход манэўраў даў магчымасьць выявіць лепшых ударнікаў, лепшых байцоў. Аднэй з лепшых каманд праявіла сябе санітарная, атрад якой складаўся амаль што выключна з жанчын-работніц. У гэтай камандзе прэміяваны—палітрук і 3 санітаркі **Крывашэіна, Буніна, Чарапахіна.** Гэта каманда зьявілася застрэльшчыкам сацспаборніцтва і актыўнейшым удзельнікам друку--выпусьціла 3 бюлетэні. Санкаманда арганізавала ўдарн. брыгады друку па асобных пытаньнях, як барацьба за дысцыпліну ў атрадзе і на вытворчасьці, брыгада праверкі выкананьня і інш. **каманда сабрала 22 рабочыя прапановы па паляпшэньні працы на вытворчасьці.**

Манэўры СПА далі штуршок і ў працы ячэек Асоавіяхіму. Неаформленыя да таго часу ячэйкі хуткімі тэмпамі пачалі афармляцца і ажыцьцяўляць сваю працу.

З гонарам сустракалі падшэфную часьць Чырвонай арміі абутнікі. Камсамольцы, работніцы фабрыкі значны ўдзел прынялі ў падрыхтоўцы чырвоных казарм да сустрэчы байцоў з манэўраў.

Фабрычны друк, абвясьціўшы сабе мабілізаваным, расставіў пасты рабкораў на вайсковых вучастках работы. Пад кіраўніцтвам партыі, уздым рабочых мас быў накіраван на выкананьне прамфінпляну, паляпшэньне якасьці прадукцыі, узьняцьце працдысцыпліны і абароназдольнасьці.

Штодзенны фабрычны бюлетэнь „Сыгнал манэўраў" прыносіў весткі з рабкораўскіх пастоў, адбіваў штодзенную працу на фабрыцы як па лініі вытворчасьці, так і па працы каманд СПА.

Адзін з галоўнейшых недахопаў у сучасны момант—гэта недастаковае замацаваньне нашых посьпехаў, дасягнутых у часе манэўраў, недастатковая сыстэматызацыя працы, некаторы спакой, здавальненьне посьпехамі.

Пасьля манэўраў мы мелі нездавальняючую яўку на ваенныя заняткі і некаторае аслабленьне работы ячэек Асоавіяхіму.

Але зараз атрады нашы ў працы падцягваюцца, санітарны атрад даўкамплектован, пачынае наладжвацца дысцыпліна, арганізавана ячэйка Чырвонага Крыжу.

Рабкоры фабрыкі сыгналізуюць аб недахопах у рабоце ячэек Асоаніяхіму, якая пачала падцягвацца за апошнія часы ў сувязі з прапрацоўкай пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі.

Значна ўзьняліся тэмпы работы на прадпрыемстве. Мы добра ведаем, што ад нашых тэмпаў, ад пасьпяховага выкананьня пяцігодкі ў значнай ступені залежыць тэхнічнае ўзбраеньне і моц Чырвонай арміі, а адсюль і абароназдольнасьць краіны саветаў.

Рабкорка.

Менск,
абутковая ф-ка.

На вечары ваянізацыі

У студзені ў клюбе мэталістаў адбыўся першы арганізацыйны вечар работніц і жонак рабочых заводу „Пралетары" сумесна з падшэфнымі часьцямі Чырвонай арміі, на якім стаяла пытаньне аб міжнародным становішчы і ўдзеле жанчын у абароне краіны. На вечары прысутнічала звыш 120 работніц і ўсіх рабочых.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу амаль што ніякай работы ў галіне ваянізацыі сярод жанчын не праводзілася. Гэты вечар зрабіў зрух у галіне ваянізацыі сярод жанчын.

Пінская Х.

Менск.



Работніца Крукоўская ударніца санкаманды зав. „Бальшавік", г. Менск.

Удзел працоўных жанчын у абароне краіны

Да XIV гадавіны рабоча-сялянскай Чырвонай арміі мы падыходзім з вялікімі посьпехамі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтвь, якія дасягнуты, дзякуючы правільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК і правадыра тав. Сталіна.

Ленінскае пытаньне „хто каго“ канчаткова вырашана на карысьць сацыялізму. XVII усесаюзная партканфэрэнцыя зацьвердзіла дырэктывы для складаньня другой пяцігодкі, — дырэктывы сусьветна-гістарычнага значэньня. Выкананьне 2-й пяцігодкі цалкам будзе залежаць ад выкананьня пляну чацьвертага, заключнага году першай пяцігодкі.

Савецкі Саюз праводзіць палітыку міру. Аднак, правакацыі супроць нас ня спынены, наадварот, узмацніліся. У сувязі з падзеямі на Далёкім Усходзе закапашылася ўся белагвардзейская зграя. Імпэрыялісты камбінуюць свае пляны інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу, ня гледзячы на балбатню ў Жэнэве аб „разбраеньні“. Адначасова японская армія сваім ботам расьціскае кітайскі народ. „Асабліваць данага моманту заключаецца ў тым, што ўсё больш сьціраецца грань паміж мірным становішчам і вайной—уцягваюцца ў вайну і ваююць без адкрытага абвяшчэньня вайны“ (Молатаў).

Будучая вайна будзе вайной мільёнаў. Капіталісты рыхтуюць свае кадры. Уводзяцца законы, якія прадугледжваюць мабілізацыю жанчын у часе вайны: ва Францыі—закон аб абароне нацый, у Польшчы—закон аб прызыве дзяўчат 18 год тэрмінам на 1½ гады і інш. У Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах, каб атрымаць грамадзянскія правы, жанчыны даюць падпіску са зброяй у руках абараняць бацькаўшчыну. Сфармаваны рад фашысцкіх жаночых арганізацый.

Усе гэтыя фаты гавораць аб тым, што імпэрыялістычныя краіны ўзмоцнена рыхтуюцца да вайны, якая ў першую чаргу будзе накіравана супроць адзінай бацькаўшчыны працоўных—Савецкага Саюзу.

Таму абавязак кожнага працоўнага СССР рыхтавацца да абароны сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Удзел працоўных жанчын у абароне СССР набывае асаблівае значэньне. Між тым работа па падрыхтоўцы жанчын да гэтай справы зьяўляецца найбольш слабым вучасткам. Слабы ахоп жанчын арганізацыяй Асоавіяхіму. У Бабруйскай арганізацыі на 33 тысячы членаў Асоавіяхіму—усяго 1.000 жанчын, у Плешчаніцкай на 3 тысячы—каля 200 жанчын.

Не ва ўсіх арганізацыях належны ахоп жанчын практычнымі відамі вайсковай падрыхтоўкі—супроцьпаветранай, санітарнай і інш. З боку некаторых арганізацый наглядаецца яўная апартуністычная недаацэнка работы сярод жанчын; слаба разгорнута масавая работа, ня ўлічваюцца асаблівасьці работы сярод паасобных груп працоўных жанчын у залежнасьці ад сацыяльна-нацыянальнага складу.

1-я ўсесаюзная нарада жанчын-членаў Асоавіяхіму падагуліла вопыт і абгаварыла практычныя мерапрыемствы работы сярод жанчын у радох Асоавіяхіму і па-за яго радамі. Для кіраўніцтва работай сярод жанчын па лініі Асоавіяхіму арганізуюцца сэктары, якія камплектуюцца за лік лепшага актыву. Актыў ёсьць. За апошнія гады ён вырас на нізавой практычнай рабоце. Трэба яго выхоўваць у далейшым, вылучаць на больш адказныя кіруючыя вучасткі, для работы ў парадку грамадзкай нагрузкі, або на штатныя пасады.

Агітацыйна-масавая работа павінна праводзіцца шляхам арганізацыі гутарак, дакладаў, сходаў работніц, калгасьніц, жонак рабочых, калгасьнікаў. Пытаньне міжнароднага становішча, абароны краіны павінна асабліва быць растлумачана сярод жанчын на вёсцы, сярод неарганізаванага насельніцтва (па жактах), каб даць адпор усялякім кулацкім правакацыйным выступленьням, каб мабілізаваць працоўных жанчын для актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.

Лепшым адказам на пагрозы інтэрвэнцыі будзе арганізацыя новых ударных брыгад імя абароны, XIV гадавіны РСЧА, Асоавіяхіму як на вытворчасьці, так і ў сацыялістычны сэктары вёскі. Павялічваючы рост Асоавіяхіму за лік жанчын, асабліва работніц і калгасьніц, неабходна шырока ахапіць іх вайскова-практычнай работай. У практычныя арганізацыі ў першую чаргу ўцягваюцца работніцы, камсамолкі, камуністкі. Асноўная задача вайсковай падрыхтоўкі—азнаямленьне і аўладаньне вайсковай тэхнікай, падрыхтоўка вайскова-навучаных кадраў па спэцыяльнасьцях (кулямётная справа, пяхота, бронятанкавая справа), падрыхтоўка кадраў для раду спэцыяльных і дапаможных служб у Чырвонай арміі (па сувязі, адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, аўта-машынах і інш.). Работа праводзіцца праз агульныя гурткі, вучэбныя пункты, спэцыяльныя курсы. Ня менш 25 проц. жанчын у радох Асоавіяхіму павінны быць ахоплены вайсковай вучобай. З ліку прайшоўшых з посьпехам вайсковую вучобу трэба рыхтаваць інструктарскі склад.

Пытаньням супроцьпаветранай абароны ў БССР ня толькі ў горадзе, але і на вёсцы трэба надаць асаблівую ўвагу. Неабходна правесьці поўную ліквідацыю вайсковай няпісьменнасьці, у першую чаргу ў прымежных раёнах.

Лік жанчын у камандах СПА трэба давесьці да 80 проц. адносна ўсяго складу, лік камандзіраў—да 70 проц. і начальнікаў камант—да 60 проц.

Уся практычная работа павінна разгортвацца на аснове сацыялістычнага спаборніцтва. Працоўная жанчына павінна стаць у рады актыву па ажыўленьні шэфскай работы і сутаварыства з Чырвонай арміяй.

Дзень XIV гадавіны РСЧА павінен стаць днём агляду гэтай работы, узаемнага абмену вопытам і дасягненьнямі ў сацыялістычным будаўніцтве і вайсковай вучобе. Неабходна дапамагчы ў падрыхтоўцы належнага папаўненьня РСЧА пры прызыве 1910 году шляхам выяўленьня клясава-чужых элемэнтаў для недапушчэньня іх у армію, ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

„Мы толькі ў тым выпадку па-сапраўднаму выканаем свае абавязкі, калі не дамо сябе ўбаюкаць ніякімі размовамі, ніякімі агульнымі рэзалюцыямі аб міжнародным становішчы. Мы павінны на справе праявіць ня толькі пралетарскі гераізм у будаўніцтве новага грамадзтва, але і сапраўдную пільнасьць і належную гатоўнасьць да абароны кроўных інтарэсаў рабоча-сялянскай дзяржавы“ (Молатаў).

И.

ПРАКТЫКА ЖАНОЧЫХ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД У КАЛГАСАХ ЧЫРВОНАЙ СЛАБАДЫ

Агляд жаночых вытворчых нарад у калгасах Чырвона-Слабадзкага раёну паказаў, што калгасы асабліва з сьвінагадоўчым і малочна-жывёлагадоўчым ухілам у большасьці маюць жаночыя вытворчыя галінныя нарады, але амаль усе яны арганізацыйна не аформіліся і праводзяць сваю работу ад выпадку да выпадку. **Толькі СТФ калгасу імя Войкава і МТФ калгасу „Новы Шлях“ увялі работу жаночых вытворчых нарад у сыстэму і практыка іх работы дае вельмі добрыя прыклады.**

СТФ імя Войкава мае ўсяго сьвінога пагалоўя 180 галоў. Гэтыя сьвіньні разьмеркаваны ў трох сьвінарніках, адзін новы і два прыстасованых старых. Жаночая вытворчая нарада сьвінарак гэтага калгасу арганізавана з восені 1931 года і сыстэматычна не радзей аднаго разу ў два тыдні зьбіраецца. За гэты час вытворчая нарада прапрацавала адозву ЦК і СНК аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, унутраны распарадак на СТФ, аб пераводзе ўсёй работы сьвінарнікаў на зьдзельшчыну, аб ліквідацыі абязьлічкі, аб правядзеньні злучной кампаніі, аб падрыхтоўцы да апаросу, аб гадоўлі маладняку і інш. У выніку добрай прапрацоўкі гэтых пытаньняў **сьвінаркі аўладалі тэхнікай сьвінагадоўлі.**

На шырокай вытворчай нарадзе сьвінарак 23-га студзеня ўдарніцы **Хаміч і Хадаровіч** у сваёй інфармацыі аб выніках работы вытворчай нарады сьвінарак гавораць так:

„У нас уведзена зьдзельшчына на сьвінарніку і поўнасьцю ліквідавана абязьлічка. За кожнай сьвінаркай замацавана па 20 старых сьвінаматак, альбо 80 галоў маладняка, ад 4—8 месяцаў за гэта мы атрымоўваем адзін працадзень, акрамя гэтага нам налічваюць працадні за якасныя паказальнікі згодна норм сьвінаводкалгасцэнтру, за большы апарос, за правядзеньне злучной кампаніі, за лепшае вырашчваньне маладняку і за павялічэньне вагі сьвіней. Такім чынам мы ў сьнежні месяцы выпрацавалі па 44 працадні.

Кармленьне сьвіней у нас пачынаецца а шостай гадзіны раніцы, потым у 12 гадзін дню і 6 гадзін ўвечары. Калі адна сьвіньня ня зьядае сваёй нормы, то лішкі перадаем другім сьвіньням, такім чынам корм у нас ня прападае. Пасьля кожнага кармленьня сьвіньней мы чысьцім кармушкі, сьвінарнікі і прыгатоўваем харчы. Уначы вартаўнік сьвінарнікаў гатуе харчы і будзіць нас, пасьля чаго роўна ў 6 гадзін раніцы мы пачынаем раздачу.

У нас яшчэ сьвінаматкі худыя, бо іх нядаўна ўкамплектавалі. Для таго, каб яны паправіліся, мы адразу пасьля апаросу адбіраем парасят у цёплае памяшканьне, падпускаем іх да сьвінаматак толькі для кармленьня, апрача таго мы падкармліваем іх малаком, зусім маленькіх парасят — цельным малаком, а старэйшых — перагонам. **Адыходу парасят у нас амаль вусім нявма.**

Для захварэўшых сьвіней мы гатуем харчы асобна ў гаршкох,

Калі сьвіньні хварэюць страўнікам, то мы ім смажым ячмень і даем малако ў гатаваным выглядзе. Хворых сьвіней мы ізалюем ад іншых.

Парасятам мы даем вугалькі для разьвіцьця касьцяка.

На сьвінарнік мы нікога ня пускаем без загадчыка фэрмы і наведвальнікаў сьвінарніка мы апырскваем для таго, каб на сьвінарнікі не занесьлі заразу.

Кожная сьвінарка адказвае ў злучную кампанію за сваю групу сьвіней. Дзякуючы гэтаму ў нас не застаецца ні аднэй не пакрытай сьвінаматкі“.

На шырокай вытворчай нарадзе абрана брыгада з калгасьніц у ліку 20 асоб для агляду працы сьвінарніку.

На МТФ „Новы шлях“ таксама працуе вытворчая нарада, якой кіруе брыгадзірка **Новік.** Праведзена 10 вытворчых нарад, уведзена зьдзельшчына на МТФ. У выніку перавода на зьдзельшчыну МТФ дабілася павялічэньня ўдоя малака. У сацспаборніцтве паміж сабою кожная даярка і даглядчыца сачыць за тым, каб яе група кароў была лепш дагледжана і каб павялічыла ўдой малака.

Недахопам у рабоце вытворчай нарады даярак у калгасе „Новы шлях“ зьяўляецца адсутнасьць пляну.

МТС і калгассаюз зусім недастаткова кіруюць працай вытворчых нарад, адсутнічае ўлік кіраўнікоў, ня склікаюцца раённыя нарады кіраўнікоў вытворчых нарад, не пераносіцца вопыт лепшых вытворчых нарад у другія калгасы.

Неабходна зараз-жа ў першую чаргу раённым кіруючым установам і арганізацыям перабудаваць работу паводле 6-ці ўмоў т. Сталіна, увёўшы ў практыку работы ўсіх калгасаў арганізацыю і сыстэматычнае правядзеньне работ жаночых вытворчых нарад.

Фрайман.

Уключаемся ў рэйд праверкі вытворчых жаночых нарад

Дэлегаткі-калгасьніцы з калгасу „Спартак“, Кармянскага раёну, уключыліся ў рэйд па праверцы працы вытворчых жаночых нарад у калгасах. Яны абгаварылі гэта пытаньне на жаночым сходзе. Жанчыны парашылі, што вытворчыя жаночыя нарады на СТФ вельмі патрэбны, што яны дапамогуць лепш наладзіць працу, што праз нарады брыгады будуць абменьвацца вопытам працы.

Апрача таго калгасьніцы ўсім сходам пастанавілі, што кожная калгасьніца павінна чытаць часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“. Для правядзеньня падпіскі сход вылучыў брыгаду. Ф. С.

Дашкольнае выхаванъне—на службу сацыялістычнаму земляробству

У справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі значную ролю адыгрывала і адыгрывае працоўная жанчына. Таму „неабходнасьць далейшага ўцягненьня працоўных жанчын у вытворчасьць і грамадзкае жыцьцё краіны патрабуе асаблівай увагі да поўнага бытавога разьняволенъня іх і ў першую чаргу арганізацыі грамадзкага камуністычнага выхаванъня дзяцей“ (з пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб становішчы і пэрспэктывах дашкольнага выхаванъня).

Надыходзячая веснавая кампанія ставіць перад намі са ўсёй вострасьцю пытанъне аб разгортваньні сеткі дашкольных устаноў ва ўсіх саўгасах і па вядучых вучастках калгаснага будаўніцтва, акрамя таго, згодна кантрольных лічбаў на 1932 год, мы павінны у прымежных раёнах ахапіць усю дзетвару дашкольнага ўзросту.

Калі перавесьці гэта на лічбы, то атрымаем, што на працягу 1932 году ў сельска-гаспадарчым сэктары рознымі відамі дашкольных устаноў мы павінны будзем ахапіць дзяцей сельска-гаспадарчых рабочых 13,5 тысяч (100 проц.), калгасьнікаў — 183 тысячы (65 проц.) і аднаасобнікаў — 44,5 тысяч (25 проц.). Плянам прадугледжваецца ахапіць палову гэтых кантынгентаў да пачатку веснавой пасеўнай кампаніі, гэта значыць не пазьней, як да 1-га мая.

Вучні ў школе ФЗС.

Для рэалізацыі гэтых плянаў НКА зараз заключае дагавары з адпаведнымі арганізацыямі, як Белкалгасцэнтр, саюз зямляробчых саўгасаў і саюз жывёлагадоўчых саўгасаў. У гэтых дагаварох прадугледжваюцца кантынгенты дзяцей, падлягаючых ахопу, крыніцы фінансаваньня і абавязкі НКА і вышэйпамянёных арганізацый.

Апрача таго ўжо даны кантрольныя лічбы раёнам па падрыхтоўцы кадраў для дашкольных устаноў, якія адкрываюцца у гэтым годзе. Кадры ўжо рыхтуюцца.

Аднак, трэба падкрэсьліць, што ў падрыхтоўцы да адкрыцьця дашкольных устаноў да часу веснавой сяўбы ў большасьці раёнаў і арганізацый ёсьць стаўка на самацёк і яўная недаацэнка гэтай справы. Такія арганізацыі, як саюзы зямлярабочых і жывёлагадоўчых саўгасаў, у сваіх першых плянах зусім выпусьцілі „такое дробнае пытанъне“, як дашкольнае выхаванъне і толькі пасьля напору НКА спахваціліся і пачалі ўключаць. Яшчэ ніводнай гаспадарчай арганізацыяй ня даны ўказаньні адносна разгортваньня дашкольных устаноў у саўгасах і калгасах.

Задачы ў галіне разгортваньня дашкольных устаноў вялізарныя. Час вельмі кароткі. Патрэбна зараз-жа раённым аддзелам народнай асьветы, райкалгассаюзам, рабочкомам саўгасаў, культбытавым камісіям калгасаў дэлегацкім сходам па-ўдарнаму мабілізаваць на гэту важнейшую кампанію ўсю грамадзкасьць. **Трэба падрыхтаваць памяшканьні, абсталяваньне, зрабіць поўны ўлік усіх дзяцей дашкольнага ўзросту і шырока прапрацаваць сярод работніц, калгасьніц і аднаасобніц тыя задачы, якія стаяць у галіне дашкольнага выхаванъня перад усёй працоўнай грамадзкасьцю ў трэцюю бальшавіцкую вясну.**

Трэба, каб раён выклікаў другі раён на сацспаборніцва па ажыцьцяўленьні плянаў дашкольнага выхаванъня, трэба даць рашучы адпор недаацэнцы гэтай справы і стаўцы на самацёк.

Неабходна падкрэсьліць, што разгортваньне сеткі дашкольных устаноў павінна забясьпечваць выхаванъне дзяцей **на роднай мове**, таму плян адкрыцьця дашкольных устаноў для нацменшасьцяй павінен быць выканан поўнасьцю.

Дашкольнае выхаванъне павінна быць пастаўлена на службу сацыялістычнаму будаўніцтву і будзе пастаўлена.

З. Нарэйка.

Узварушыць працу лікпункту

У камуне „Чырвоны артылерыст“, аддзяленьня Галічана, Міхіраўскага сельсавету, арганізован лікпункт, у якім павінна займацца каля 50 асоб. Але праца лікпункту сарвана, бо настаўнік т. Капушонак ігнаруе гэту справу.

Інспэктару нарасьветы трэба зьвярнуць на гэта ўвагу.

Ударнік.

Дэлегаткі-калгасьніцы, ці абгаварылі вы пытанъне арганізацыі дзіцячых ясель і пляцоўкі на дэлегацкім сходзе. Пішэце ў часопісь, ці падрыхтавана для гэтага памяшканьне і патрэбныя прылады

Рыгор Сымкевіч

З ДАПАМОГАЮ ШТОДЗЕНКІ

(*Нарыс*)

Па дарозе член рэдкалегіі калгасу „Случ № 2“ Слуцкага р. сустрэў Васю жанчыну—калгасьніцу сярэдняга ўзросту. Яе шчокі пылалі агнём. Яна падыйшла да яго бліжэй, распрастала сваю хусгку (якая закрывала амаль увесь твар), аслабаніла падбародак і пачала гаварыць:

— Гэта-ж я да вас. Кажуць, нібы вы правяраць будзеце брыгадай... Дальбо? кажу, проста рукі не распрамляюцца пасьля такога ўліку. Робіш кожны дзень. І ўдарніца. А яны дык па 2—3 дні прапушчаюць ды не запісваюць ні ў кніжку, ні ў табэль, а потым шукай іх.

— Хто гэта яны.

— Ды вось, брыгадзіры ў канцылярыі, вучотчык ці як яго завуць.

— Ты-ж ня крычы. Мы вось даведаемся і справу ўладзім.

— Да толькі-ж хутчэй уладзьце, бо я-ж ударнічала, а гэтыя бюракраты не пазапісвалі мне, дык і выходзіць, нібы я прагульшчыца...

Доўга выказвала яна сваю крыўду члену рэдкалегіі газэты „За бальшавіцкія тэмпы“.

— Уладзім...—атрымала Вася адказ.

У гэты-ж дзень на нарадзе рэдкалегіі ішла гутарка аб арганізацыі рэйду па асобных вучастках работы.

— Зацягваць нельга. Штодзенка павінна ў гэтым напрамку праявіць бальшавіцкія тэмпы, Нам патрэбна справу ўліку паставіць на вышэйшую ступень.

Рэйд... Па праверцы ўліку і дапамогі праўленьню. Рэдкалегія прыступіла да арганізацыі рэйду.

* * *

У закуранай тытунём канцылярыі праўленьня мільгацеў агенчык лямпы. Закураны выгляд лямпы і заросшы пылам яе каўпак нагадваў тую-ж самую канцылярыю, сьцены і плякаты якое пакрыты густым дымам—закураныя, ад штовячэрнага наведваньня яе калгасьнікаў, якія курылі цыгарку за цыгаркай.

— Нейкі магнэт у канцылярыі. Як прыдуць, то пакуль тутунём хату не напаўняць, дадому спаць ня пойдуць—растлумачвае старшыня калгасу.

Брыгада заняла месца і, разлажыўшы табэлі і вучотныя кнігі, распачала сваю працу.

У гэты дзень, калі калгасьніцы даведаліся аб рэйдзе па праверцы ўліку працы адзін за другім ішлі са сваімі скаргамі да ўдзельнікаў брыгад. У гэты дзень у канцылярыю прышоў і дзядзька Мацьвей.

Член рэдкалегіі шматтыражкі калгасу „Случ“ Алеся Арабей за выпускам газэты.

— І я, цётачка Алеся хачу вам сказаць пра тое, самае, пра працоўную сваю кніжку, — зварачаецца ён да жанчыны—члена рэдкалегіі. Цалюсенькі месяц ляжыць яна тут у канцылярыі, ды хоць бы хто слаўцо пяром туды закінуў. А ведаюць-жа, ліха іх, што ўлік—гэта, як я чытаў і ў нашай газэце—сацыялізм.

— Так, дзядзька правільна улік—гэта сацыялізм, і вось мы, брыгадзіры, прышлі сюды ад рэдакцыі сваёй штодзенкі, каб праверыць пастаноўку ўліку і дапамагчы наладзіць яго.

— Я-ж і кажу, добрая гэта справа брыгада. Яна ўсюды дапаможа... Вы-ж, таварышы, не забудзьце і пра маю працоўную кніжку.

— І нам па 2—3 дні не запісалі. З сарамлівым голасам зварачаецца Ульяна да брыгадзіра рэйду.

— Праверым...

Праз некалькі хвілін падышла маладая, жвавая дзяўчынка-камсамолка Саламея і нешта паказвала ў працоўнай кніжцы. Скаргі адна ва другой даходзілі да брыгад. Яны былі ўважліва выслуханы, ім быў дан належны напрамак. А ўвечары Алеся, праз свае шкляныя кружочкі праглядала вачыма табэлі, улікавыя працоўныя кніжкі і на маленькім кавалку паперы рабіла свае заўвагі.

Брыгада прыступіла да абгаварэньня выяўленых недахопаў. Яна пачала складаць вынікі рэйду.

— Недахопаў, браткі, шмат. Аднаму лішніх дзён запісалі, другому недапісалі, а трэцяга зусім пазбавілі кніжкі. Нарады на работу не выдаюцца сыстэматычна, ды ці мала яшчэ розных дробязяй, недахопаў. Іх трэба зьнішчыць. Непаладкаў не павінна быць.

— Давайце, пісаць прапановы:

— Для ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тар. Сталіна і зьнішчэньня недахопаў па ўліку працы неабходна запаўненьне працоўных кніжак ускласьці на адказных брыгадзіраў па кожным вытворчым вучастку. Нарады даваць і выпісваць загадзя не пазьней, як за 2—3 дні да пачатку працы, і перадаваць адказнаму брыгадзіру...

— Трэба, браткі, яшчэ пра якасьць працы, бо па табэлях адзнак якасьці ня відаць...

— Алеся піша...

... Улік працы па табэлях павінен абавязкова прадугледжваць колькасьць і якасьць працы. Табэль нарадаў варочаць брыгадзірам у канцылярыю сваячасова...

— І яшчэ...

— З прычыны таго, што ў часе агляду выяўлена памяншэньне і павялічэньне працадзён па працоўных кніжках, а таксама незанясеньня колькасьці працадзён за некалькі месяцаў у працоўныя кніжкі, многіх калгасьнікаў, вінаватых прыцягнуць да адказнасьці. І ў дэкадны тэрмін праверыць лік працы ўсіх калгасьнікаў, якія падалі скаргі аб няправільным уліку працадзён.

— Заутра на праўленьні калгасу патрэбна зрабіць інфармацыю.

— Таварышу Ганне даручым зрабіць інфармацыю.

— Ой... ды я-ж.., Няхай Алеся зробіць.

— Нічога, і Ганна зможа.

Да 8-га сакавіка даб'емся яшчэ большай мабілізацыі калгасьніц, саўгасьніц і аднаасобніц вакол задач 3-яй бальшавіцкай вясны, на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

Рыхтуемся да вясны

Наш калгас „На варце ленінскага шляху", Асьвейскага раёну, рыхтуецца да пасеўнай кампаніі. Вылучылі брыгаду з 4 жанчын па ачыстцы насеньня і брыгаду па вывазцы гною. Палова насеньня ўжо ачышчана.

Інвэнтар рамантуецца, ужо маем спраўных 10 плугоў, 20 хамутоў і 21 вяроўку.

Дрэнна толькі ў нас з разьмеркаваньнем ураджаю. Сена да гэтага часу не разьмеркавалі. І кожны калгасьнік, калі яму трэба карміць сваю неаграмаджаную жывёліну, ідзе і бярэ колькі хоча, бяз усякага кантролю. Такі парадак прывядзе да таго, што ня хопіць корму. Трэба зараз-жа безадкладна разьмеркаваць сена па працаднёх.

А. Л.

Раўняйцеся па калгасе „Случ"

Калгас „Случ", Ісернскага сельсавету (Слуцкі раён), дабіўся значных дасягненьняў у справе свайго арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня.

Плян збожжазагатовак у 164 цэнтнэры выканан і перавыканан (зданы 173 цэнтнэры). Заданьне па мабілізацыі сродкаў таксама выкананы; падатак на 100 проц., страхоўка—на 100 проц., пазыка „3 ці рашаючы"—на суму 1400 р. —перавыканана. Унесьлі на акцыі Трактарацэнтру 500 руб. Плян будаўніцтва перавыканан; пабудавана сіласная вежа звыш пляну. Плян сіласаваньня выканан на 200 проц. Плян зяблёва перавыканан.

На СТФ уведзена прэміяльна прагрэсыўная зьдзельшчына і вядзецца штодзенная праверка яе ажыцьцяўленьня. У справе падрыхтоўкі да 3-яй бальшавіцкай вясны дасягнулі значных посьпехаў. Складзен плян веснавой сяўбы, падрыхтавана чыстагатунковае насеньне на 100 пр. Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару канчаецца.

Выпушчаецца штодзенная насьценная газэта і арганізаваны выпуск штодзенных бюлетэняў на 2-х вучастках работы—на СТФ і ў аддзяленьні калгасу. Ужо выпушчана за ўвесь час 150 нумароў насьценгазэты, якая з нумару ў нумар сыгналізавала аб недахопах і дабілася таго, што ў сьвінарніку суха, і сьвінаркі замацавалі сябе на 3 г.

Іншыя калгасы Случчыны павінны раўняцца па калгасе „Случ".

А. Ш.

Трохдзенка дапамагае

У калгасе „Новы селянін" арганізавалася тродзенная газэта. Яна аб'яднала вакол сябе актыў калгасу.

Газэта арганізоўвае працу па сацспаборніцтве і ўдарніцтве, жорстка б'е па недахопах, выкрывае шкоднікаў.

Праца ў калгасе з выхадам трохдзенкі значна палепшылася. У сьвінарніках стала чыста і цёпла, зьнізіўся адыход маладняка.

Працаўнікі СТКФ **Гурава Арына, Быхаўчук М. і Кавлоў П.** аб'вясьцілі сябе ўдарнікамі па доглядзе жывёлы і заключылі паміж сабою сацумовы.

Адыход маладняка яны абавязаліся зьнізіць да 3—5 проц. і дабіцца тоны мяса з аднаго апарасу ў шасьцімесячным узросьце.

Іншыя калгасьніцы і калгасьнікі павінны раўняцца па ўдарніках.

М. Ш.

Брыгадзір Нікітава заносіць у кніжку працадні—калгас „Улада Саветаў".

З ДАПАМОГАЮ ШТОДЗЕНКІ

(Працяг)

З такой думкай брыгада разышлася па хатах.

* * *

На пасяджэньні праўленьня калгасу Ганна дакладвала аб становішчы ўліку працы ў калгасе. Яна зачытвала прапановы брыгады.

— Пытаньне наладжаньня ўліку працы — надзвычай сур'ёзная справа—адзначыў старшыня калгасу тав. Новікаў. І таму прыдзецца пасядзець да 2—3-х гадзін і дэтальна разабраць вынікі.

Так яно і было, у 3 гадзіны скончылі абгаворваць вынікі, з якімі праўленьне цалкам згадзілася.

З гэтага часу быў зроблен пералом у рабоце. Брыгадзіры, селькоры, студэнты дапамагалі сканчэньню разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў, штодзенка „За бальшавіцкія тэмпы" дапамагла праўленьню калгасу праз брыгады і газэту выйсьці з таго прарыву, у якім апынулася канцылярыя. Але гэта яшчэ ня ўсё.

Улік працы павінен быць пастаўлен на належную вышыню, бо ўлік гэта сацыялізм.

ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ Ў МАСАВАЙ ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН АСЬВЕЙШЧЫНЫ

Асьвейскі раён мае ільнаводча-жывёлагадоўчы ўхіл. Удзельная вага культуры ільну сярод іншых культур па раёне складае 16,4 проц. і асобна па калгасным—сектары 25,4 проц.

Раён калектывізаваны на 46,8 проц. Усяго ў раёне ёсьць 61 калгас, якія аб'яднаюць 1.872 гаспадаркі.

Лён і жывёлагадоўля патрабуюць больш жаночую рабочую сілу, і таму на масавую працу сярод жанчын, здавалася-б, павінна была быць зьвернута належная ўвага з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Але на справе тут ня зусім так.

На працягу 1931 году склікаліся раённыя, канфэрэнцыі калгасьніц і аднаасобніц па пытаньнях гаспадарча-палітычных кампаній—веснавой пасеўнай, уборачнай, загатовак і інш. Але, на жаль, усе пастановы гэтых канфэрэнцый заставаліся ляжаць у неапрацаваным выглядзе ў тых, хто іх праводзіў, і не даводзіліся да шырокіх мас калгасьніц.

Усяго па раёне ёсьць 14 дэлегацкіх сходаў; адзін з іх яўрэйскі. Дэлегатак налічваецца 891. Дэлегацкія сходы арганізаваны пры калгасах, яны яднаюць і аднаасобніц наўкольных вёсак.

Да пачатку працы дэлегацкіх сходаў было 111 дэлегатак аднаасобніц, зараз 91 з іх уступіла ў калгасы.

Дэлегаткі вдалі дзяржаве са сваіх уласных гародаў звыш пляну 102 цэнтнэры бульбы і два чырвоныя абозы ільну ў 50 пудоў.

Дэлегаткамі былі арганізаваны дзьве брыгады па зяблеве, але гэты добры пачын ня быў падтрыман ні мясцовымі парт'ячэйкамі, ні праўленьнямі калгасаў, і таму брыгады распаліся, не змаглі працаваць. У калгасе „Колас Калініна" была брыгада па зяблеве з 13 чалавек дэлегатак. Праўленьне дало гэтай брыгадзе толькі 4 плугі і 4 коняй і замест падтрыманьня ўздагон несьліся насьмешкі: „пабачым, пабачым, як бабы наараць". Парт'ячэйка аб гэтым ведала, але не рэагавала.

Дэлегацкія сходы мала займаліся вытворчымі пытаньнямі ў калгасах (барацьба за якасьць прадукцыі, за правільныя нормы, поўны выхад на працу і інш.). Ня гледзячы на тое, што дэлегацкі сход калгасу „На варце ленінскага шляху" працаваў сыстэматычна, першы падняў пытаньне аб увядзеньні зьдзельшчыны, працу па апрацоўцы ільну яны не змаглі як сьлед арганізаваць, і лён згніў. У гэтым-жа калгасе дэлегаткі маюць паменшаныя нормы па доглядзе сьвіней, у выніку яны працуюць у дзень 2—3 гадзіны.

У калгасе „Авангард", дзе ёсьць дэлегацкі сход, праца па апрацоўцы ільну ня была арганізавана, лён пагніў на полі, згніло дрэнна захаванае насеньне.

Плянавасьці ў масавай працы сярод жанчын унутры калгасаў ня было. Праводзіліся сходы ад часу да часу. Праца з жаночым актывам зусім не праводзілася.

Пастанова ЦК наконт вылучэньня лепшых ударніц-калгасьніц на кіруючую працу ня выканана. Ня гледзячы на тое, што ў радзе калгасаў амаль выключна скарыстоўваецца жаночая рабочая сіла, у кіруючых органах калгасу жанчын няма. У калгасе „Свабода" працаздольных жанчын 30, мужчын—5, а ў праўленьне выбраны выключна мужчыны.

У складзе старшынь калгасаў, няма ніводнай жанчыны ў той час, як у паасобных калгасах ёсьць актыўныя калгасьніцы, якіх можна было б вылучыць на кіруючую працу.

Па 33 калгасах у праўленьнях налічваецца толькі 19 жанчын, дый тыя ў практычную працу ня ўцягнуты. Нагрузкі ніякай, як члены праўленьня, не нясуць (к-сы „Прывазерны", „Авангард" і інш.).

Члены сельсаветаў—жанчыны (па раёне іх 43 чалавекі) слаба ўцягнуты ў практычную працу. У прэзыдыуме РВК ёсьць адна жанчына, але яе нават ня лічаць патрэбным выклікаць на пасяджэньні прэзыдыуму. За ўвесь час яна была толькі на 3-х пасяджэньнях прэзыдыуму.

У сэнсе падрыхтоўкі кадраў з жанчын калгасьніц і павышэньня іх кваліфікацыі зроблена вельмі мала. Да падбору кандыдатур на розныя курсы падыходзілі вельмі нядбайна. За ўвесь год прапушчана праз курсы сіласаваньня 7 асоб, рахункаводаў—12, трактарыстак—17. З трактарыстак, скончыўшых курсы, на практычнай працы выкарыстаны толькі 5, іншыя скарыстаны па другой галіне, што таксама зьяўляецца недарэчнасьцю.

Партшколамі па раёне ахоплена толькі 120 калгасьніц—гэта лічба зьяўляецца малой.

Бюро РК мінулага складу пытаньнямі масавай працы сярод жанчын не займалася. Не заслухала на працягу году ніводнай парт'ячэйкі. Ячэйкам ніякіх дырэктыў у гэтай галіне не давалася. Уся гэта праца праводзілася бясплянава, прыстасоўвалася толькі да кампаній. Кіраўніцтва ячэек жанпрацай заключалася ў вылучэньні кіраўнікоў, дый то ня ўсе сходы іх мелі. Кіраўнікі часта мяняліся, што срывала работу дэлегацкіх сходаў.

Зусім слабая масавая работа была праведзена вакол практычнага ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна ў калгасах, вакол іх арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня.

У часе перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў, праз сходы дэлегатак, праз правядзеньне раённых нарад па асобных галінах сельскагаспадарчай вытворчасьці, нарад актыву, **неабходна мабілізаваць работніц саўгасаў, калгасьніц і аднаасобніц на актыўны ўдзел у надыходзячай пасеўнай кампаніі, на практычнае правядзеньне ў жыцьцё 6-ці ўмоў т. Сталіна, на ажыцьцяўленьне ўсіх мераприемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Дасканальна прапрацаваць рашэньні XIV зьезду КП(б)Б і XVII канф. УсеКП(б). на дэлегацкіх сходах жанчын. Плянава пабудаваць працу сярод жанчын як у раённым маштабе, так і ў кожным калгасе і саўгасе. Больш сьмела вылучаць лепшых ударніц на кіруючую працу.**

Бараноўская.

Падрыхтоўку да 8 сакавіка правесьці пад знакам яшчэ большай мабілізацыі шырокіх мас работніц на выкананьне і перавыкананьне колькасных і якасных паказчыкаў 4-га, заключнага году пяцігодкі

Па ўдарнаму выканаем прамфінплян

На нашай фабрыцы („Кастрычнік“ гор. Менск) адчыніўся новы шоўкавы цэх, які раней не існаваў. У гэтым цэху працуюць старыя кваліфікаваныя рабочыя, каля 70 проц. з іх жанчыны.

Наш цэх яшчэ ня выконвае прамфінплян з прычыны таго, што апэрацыі вельмі перагружаны і мяняюцца фасоны. З боку некаторых рабочых і работніц таксама наглядаюцца перашкоды ў выкананьні прамфінпляну. Так напрыклад работніцы **Рубінштэйн** і **Гэршоўская** пазьняцца на працу. **Голуб** дае дрэнную якасьць. Адміністрацыя сваячасова прыняла меры і гэтыя хібы выпраўляюцца.

Ударнікі і ўдарніцы нашага цэху абвясьцілі сябе мабілізаванымі на выкананьне прамфінпляну першага кварталу і ўвесь наш цэх уключыўся ў фабрычны конкурс па выкананьні якасных і колькасных паказчыкаў прамфінпляну.

Другая зьмена шоўкавага цэху выклікала на сацспаборніцтва першую зьмену на лепшае выкананьне прамфінпляну.

Ударніцы і ўдарнікі ўсе як адзін заяўляюць, што прамфінплян першага кварталу заключнага году пяцігодкі мы выканаем па-бальшавіцку.

Вока.

Менск, ф-ка „Кастрычнік“.

6 умоў т. Сталіна ў панчошным цэху ф-кі „Чырвоны тэкстыльшчык“

Наша фабрыка вядзе барацьбу за практычнае ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна. Ураўнілаўка і абязьлічка ўнутры цэхаў канчаткова ліквідавана.

У панчошным цэху арганізаваліся дзьве гаспадарча-разрахунковыя брыгады, якія заключылі дагавары з адміністрацыяй і заводам, у якіх прадугледжана: 1) Выкананьне вытворчага плану на 100 проц. 2) Выкананьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна. 3) Выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па ахове працы. 4) Выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па ліквідацыі браку. 5) Выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па эканоміі сыравіны. 6) Выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па ліквідацыі прагулаў. 7) Выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па ліквідацыі цякучасьці работніц.

Брыгады ўзялі на сябе абавязацельствы: 1) Выканаць вытворчы план на 100 проц. 2) Выканаць 6 умоў тав. Сталіна. 3) Выканаць мерапрыемствы па ахове працы на 100 проц. 4) Выканаць мерапрыемствы па ліквідацыі браку на 100 проц. 5) Выканаць мерапрыемствы па эканоміі сыравіны на 100 проц. 6) Выканаць мерапрыемствы па ліквідацыі прагулаў на 100 проц. 7) Выканаць мерапрыемствы па ліквідацыі цякучасьці работніц на 100 проц.

Брыгады ўзялі на сябе абавязацельствы выканаць 6 умоў тав. Сталіна, выканаць вытворчы план на 100 проц. і ўсе мерапрыемствы, якія прадугледжаны дагаворам.

Брыгада: **Жыгановіч, Цімакова, Адліванкіна, Турына і Хлеўзэр.**



Ткачыха Лявонава за станком інжынэра Асарава.

Патрабуем выкананьня наказу аб пабудове пральні

Санітарнае становішча інтэрнату работніц фабрыкі „Вэзуві“ нездавальняючае. Кубатура малая, цесната. Уборка несваячасова праводзіцца. Бялізна сушыцца ў кухні і ў пакоях. На сьценах пакояў — павуціньне. Часта можна ўбачыць брудную бялізну пад падушкай работніц. Пральня пры інтэрнаце да апошніх дзён была зачынена і толькі гэтымі днямі яе адкрылі. Але-ж гэта пральня не здавальняе запатрабаваньняў работніц, бо ў ёй самі работніцы мыюць бялізну.

У такім буйным фабрычна-заводзкім цэнтры, як Нова-Беліца, дзе ёсьць некалькі заводаў і буйная фабрыка, няма пральні.

Пры перавыбарах райсавету рабочыя і работніцы ф-кі „Вэзуві“ ўнесьлі пункт у наказ аб пабудове ў Нова-Беліцы пральні, але гэты пункт ня выкананы. Замест таго, каб у вольны ад работы час, або ў выходныя дні работніцы займаліся вучобай і культурным разьвіцьцём, яны вымушаны мыць сабе бялізну.

Пры агульным памяшканьні ёсьць чырвоны куток і лікпункт. У чырвоным кутку праводзіцца галосная чытка газэт, лекцыі доктара на розныя тэмы і ўсялякія гутаркі.

Лікпункт работніцы наведваюць добра на ўсе 100 проц.

Фабрычным арганізацыям неабходна палепшыць санітарнае становішча агульнага памяшканьня, узмацніўшы іх лепшым гаспадарчым наглядам.

Брыгада ставіць пытаньне перад гарсаветам аб хутчэйшым выкананьні пункту наказу аб пабудове пральні ў Нова-Беліцы.

Брыгада часопісі і шматтыражкі „Трускі“: ЗАРЭМБА З., АСАДЧАЯ, ХАБЛАВА Н., ЦАРКОВА, РАХЛЕНАК.

Для аўладаньня тэхнікай вытворчасьці ў нас арганізаваны гуртки, у якіх займаюцца работніцы

Трох работніц—**Петражыцкую, Левіну Р. і Брадовіч—ужо вылучылі ў якасьці механікаў; яны добра спраўлаюцца з працай.** Ёсьць яшчэ адна работніца для вылучэньня—**Гінзбург—яна добра кваліфікаваная, сыстэматычна перавыконвае прамфінплян і разам з тым дае добрую якасьць**, з працаю мэханіка яна справіцца.

Але ня ўсё мы яшчэ зрабілі. На фабрыцы яшчэ адсутнічае арганізаваны набор рабочай сілы. Не ліквідавана яшчэ ўраўнілаўка паміж цэхамі.

Трэба і надалей весьці рашучую барацьбу за выкананьне ўсіх 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

„Босая команда"

ЗОРНАЯ

I

... Сьмялей націскай „лапу"*) рука... Рві „кастылі".. .**) Р-р-раз. Два. Раз...

... Зелень, блакіт, жоўты пясок—фарбы беларускай прыроды. Скрозь кусты, па мастку і далей праз палі, лясы, балоты—цягне ўпарта чыгунка свае рукі. Рукі тонкія, чорныя—бясконцыя і прагавітыя, імклівыя рукі.

Імкнуцца яны прайсьці праз усю зямлю, ахапіць, пераплесьці дарогі.

Імкнуцца яны ўсе фарбы зямлі злучыць у адзін прамяністы малюнак.

Імкнуцца яны злучыць усе багацьці зямлі...

І імкнуцца злучыць тых далёкіх і родных, што будуюць багацьці зямлі, што стварылі і рукі чыгункі.

І шмат трэба працы, шмат моцы змаганьня—пакуль перамога.

Таму заўсёды суровы погляд чыгункі. Сыходзяцца — разыходзяцца рэйкі, як бровы ўдумлёнага рабочага за адказнай работай ля складанай машыны.

Злучыць, злучыць, злучыць—памятае чыгунка, каб новае жыцьцё і братэрства будаўнікоў яго квітнела маладосьцю, здаровай, напружанай, творчай працай, зьвінела песьнямі радасьці і шчасьця.

А... праз некалькі гадзін па рэйках пройдзе цягнік. У ім паедуць людзі, каб бурыць працу, каб перашкодзіць злучэньню родных, каб пасеяць у жыцьцё працоўных гора і пакуту.

Таму... сьмялей рука націскай на жалезную „лапу". Хай „лапа" рве кастылі...

Ня пройдзе цягнік. Жывуць сьветлыя, моцныя людзі, што жыцьця не шкадуюць для шчасьця працоўных.

---

*) „Лапа"—жалезны лом з вілкай на канцы.

**) „Кастылі"—цьвікі, якімі прымацаваны рэйкі да шпал.

Р-р-раз. Два. Некалькі раз і некалькі „кастылёў" упалі на пясок. Гатова. „Лапу"—пад масток.

Якая прыгожая раніца. Абуджаецца гай, сьвятлеюць прасторы поля. Як пяшчотна заглядае ў твар узыходзячае сонца—нібы сакратар ячэйкі выдае дзяўчыне камсамольскі білет. А ветрык—таварыш камсамолец—жартліва гуляе канцамі хусьцінкі на галаве дзяўчыны і падбадзёрвае:



Сьмялей рука націскай на жалезную лапу, хай лапа рве кастылі.

А ў арэшніку Кіршу чакаў вараны.

* * *

... „Расквятнэлі
пэнсі бялых руж,
вруцься, Ясю,
з тэй ваенкі,
вруць...".

Пяць коняй. Пяць жаўнэраў. Пяць вінтовак. Пяць бізуноў і—пяць галасоў у адным сьпеве. Сьпеў сумны. Сьпеў ласкавы ў ранішняй ліпнёвай цішы, у пару гаю, травы, у гуках абуджанага поля—ускалыхнулася, пачулася родная пяшчота дзяцінства.

Успомнілі жаўнэры—маці.. сястру.

Любу...

Што разлучыла жаўнэраў з роднымі. Непатрэбная, крывавая, прагавітая „ваенка".

Хвіляй быў успамін. Далей помнілі жаўнэры—скакаць у Нізкі. Загад паручніка—„злапаць тых бальшавікоў".

Жаўнер выканаў загад афіцэра. Толькі жаўнэр ня мае ўлады, ня мае права, ня мае волі.

Скакаць у Нізкі і злапаць тых бальшавікоў.

* * *

Сіняе полымя—неба. Пылам курыцца дарога. Нясецца конь.

Яздок заўзяты. Смуглыя рукі сьціскаюць повад. Босыя ногі б'юць варанога.

Яздок—заўзяты. Стан падаўся наперад. Твар насустрач ветру. Кудры па ветры—назад. На чорным паветры зьвісла хусьцінка—васількі ў жыце.

Яздок—заўзяты. Наперад, усё наперад. Ляцяць, гараць чорныя іскрынкі вачэй.

— Ну, варончык, ну прыгожы, хутчэй, хутчэй... Ня выдай, памажы Кіршы,—шэпча дзяўчына каню.

Ужо блізка. У бок дарогі паказаліся Нізкі. Праз жыта дугою канём—і Кірша ў Нізкох.

II

Стагналі працоўныя беларускай вёскі. Сумавалі старэйшыя па лепшых маладых, што на вайне. Шкадавалі гаспадароў, пагнаных у польскі абоз без парадку і тэрміну.

Чулыя дзіцячыя істоты адбівалі настрой большых. То яны гулялі ў фронт, то палахліва ўглядаліся ў дарогу. Баяліся яны польскіх жандараў, ад якіх плакалі іх маткі і хмурылі вочы бацькі.

Стагналі працоўныя беларускай вёскі пад гнётам белапалякаў.

Павал наклаў воз жытніх снапоў. Раптам яго ўвагу зьвярнуў пыл на дарозе і ў ім цьмяныя плямы. У момант Павал адпрог каня, ускочыў на яго і праз загуменьне „нацянькі"—памчаў у горад. Ружовая кашуля—пузыром на сьпіне.

— Не ўцячэш... І ў горадзе знойдуць цябе. Увязуць далёка палякі. Разлучу цябе з ёю,—злосна шаптала Галена і на вочы яе набягалі сьлёзы, бліскучыя сьлёзы ўпартае помсты.

Маладая, прыгожая Галена, збалаваная сытым жыцьцём і любаваньнем усім яе прыгоствам, пакахала статнага Паўла.

Хата Галены і Паўла былі побач. Новая хата Галены была з вакяніцамі і з квяцістым гародчыкам пад вокнамі. Да старой хаты Паўла вяла бліскучая, добра вытаптаная, сьцежка, і Павал кахаў прыгожую Галену. Але Павал на хацеў ісьці жыць да бацькі Галены.

— Кінь бацькоў. Хадзі ў маю хату. Мы маладыя і здаровыя. Не прападзем—казаў ён Галене.

Не згадзілася Галена. Не захацела дзяўчына з новай хаты з вакяніцамі па зьбітай вузенькай сьцежцы перайсьці ў старую Паўлаву хату. Не захацела Галена падзяліць з Паўлам яго працу, яго жыцьцё.

У адмове Галены Паўлу была яшчэ адна добра захаваная ад людзей думка.

У Нізкох Павал карыстаўся пашанаю сялян. Яму часта даручалі яны сур'ёзныя, грамадзкія свае справы.

Галена была ўпэўнена, што Павал не ўстаіць супроць яе жаночага хараства і згодзіцца на ўступку ёй—пяройдзе жыць да Галены. Галена—адна дачка ў бацькоў, і Павал зробіцца гаспадаром іхняй маемасьці, будзе хаваць яе і пашыраць. Будзе лагодным і шчасьлівым іх жыцьцё. І гэта яшчэ ня ўсё. Вялікую небясьпеку чула Галена з боку чырвоных. Яны супроць багатых. Калі прыдуць чырвоныя, у Нізкох будзе новая ўлада—сельсавет. Напэўна Паўла выбяруць. А як Павал будзе ўжо „шляхетны" гаспадар, ён і пацягне ў бок багатых. А беднаты Нізкоў ня будзе мець аднаго з разумных моцных кіраўнікоў. А чым менш будзе арганізаванай беднаты, тым лепш Галене і ўсім багатым у Нізкох.

Таму Галена сачыла ўсюды за Паўлам.

Гэта лета яна часьцей за ўсё бачыла Паўла ў гутарцы з „праклятай татаркай", гэтай „босай камандай". Зьненавідзела Кіршу Галена. Усё думала—як разлучыць Кіршу з Паўлам.

У сьвята аднойчы ў іх гасьцявала ўсё польскае мястэчка: камэндант, войт, пісар і ксёндз. Між іншым, Галена з агіднай мінай, зморшчыўшы свой прыгожы носік, казала войту:

— Ат, усе бедныя—гультаі і таму бедныя. І ўсе яны—бальшавікі і супроць паноў і маемасьці—ад зайздрасьці. І чым бяднейшы, тым больш заядлы з яго бальшавік.

У гэты момант якраз міма вокан прайшлі Павал з Кіршай.

— А ў Нізкох шмат бальшавікоў,—хітра павёў вокам камэндант.

— Са два ёсьць. Але ці ня хоча пан зрабіць з мяне здрадніцу і шпіёна. Галена какетліва засьмяялася і наліла пану чарку.

Ад зайздрасьці закружылася ў галаве Галены. Выдала яна Паўла жандарам. „Пакуль толькі разлучу з Кіршай"—думала яна. „Яго напэўна пасадзяць у мястачковую турму. Праз камэнданта я Паўла, як свайго жаніха, вызвалю адтуль. Ну, ён і жэніцца на мне. А жэніцца, пераменіцца—мой і наш будзе"—гэтак разважала шляхцянка.

Ах, спазьнілася Кірша. Не пасьпела папярэдзіць таварышоў. Раней за Кіршу прыляцелі жаўнеры ў Нізкі і па ўсім відаць—нарабілі тут спраў.

У Нізкох—енк і плач. Арыштавалі і павезьлі з сабой чатырох бяднейшых хлапцоў. Павал уцёк. Але нехта падказаў пра Паўла і два жаўнеры паехалі за ім уздагон.

Начыста абрабавалі Нізкі белапалякі. Абрабавалі за тое, што нізкоўцы самі раней не данесьлі ў гміну аб бальшавікох, што зараз не называлі іх. Бізун у волю пагуляў у Нізкох.

Усё чысьценька забралі са сьвірану Ібрагіміхі, бо Кіршы брат Солім—чырвонаармеец, бальшавік.

Горка плакала Ібрагіміха, жалячыся дачцы.

Кірша няўважліва слухала, што казала ёй маці. Ат, што губляць ім з маткай. Бацьку Кіршы—рабочага гарбарні—забіла нямецкай бомбай. З таго часу Ібрагіміха стала хварэць. Яны перабраліся на вёску. На апошнія, схаваныя „на чорны дзень", грошы купілі хатку. Кармілі адну сьвіньню. Каровы ня было. Брат Кіршы Солім езьдзіў у заработкі з канём. Зямлі было—адзін агарод. Як пайшоў Солім на вайну, засталася адна Кірша (маці ўсё хварэла і зарабляла толькі-толькі на хлеб). Так і завуць яе Кіршу багатыры вёскі „босаю камандаю".

Ня тое непакоіла зараз Кіршу. Ледзь адказаўшы маці, яна бяжыць на вуліцу да дому Паўла.

У апошнія часы вёска ўся жыла на вуліцы. Усіх працоўных вёскі хвалявала адно гора—уціск балапалякаў. Усіх мучыла адна думка — жаданьне, калі прыдзе збавеньне. Было-ж цяжка дыхаць насычаным дыханьнем ворага паветрам. Было цяжка слухаць плач і енкі галодных, прыгнечаных.

І зараз усе Нізкі на вуліцы.

Кірша ўвайшла ў хату Паўла. У хаце было пуста, а рэчы дагары нагамі. Шукалі, пароліся. Кірша памятае ўмову, калі што—аддаць абрэз Мурэйку, сьлесару ў горадзе. Кірша ведае, дзе схаваны абрэз. Вось тут—пад падлогай ля печы, падняць дошку. Кірша дастала абрэз і схавала пад хустку, якую для гэтага наў-

Ну, Варончык, ну прыгожы, хутчэй, хутчэй.., Ня выдай, памажы Кіршы.

мысьля накінула на плечы. Самы раз цяпер пранесьці абрэз дамоў, бо ўсе занятыя ўражаньнямі сённяшняга дня, не заўважаць Кіршу. Абрэз Кірша схаваe на гародзе.

Кірша—гэткая маленькая кропелька ў моры змаганьня з ворагам, зусім, зусім маленькая кропелька. Але яна з гатоўнасьцю зробіць усё, што ў яе моцы і ў магчымасьцях яе жыцьця. Кірша ненавідзіць усіх паноў на сьвеце, усіх, хто жыве з чужой працы.

А як падумае дзяўчына, што ў хуткім часе прыдуць чырвоныя, прынясуць з сабой волю, працу на сябе, новае жыцьцё, свабоднае, уласнае—хочацца Кіршы жыць ды жыць.

Кірша, годзе марыць,—пакарыла сябе дзяўчына і хутка пабегла дамоў, проста на гарод.

Ах, якія добрыя гарбузы. Якое густое шырокае лісьце. „Вось тут і палажу"—парашыла Кірша і палажыла абрэз у гарбузы.

Галена з гародчыку сачыла за Кіршай. Цікава Галене, што робіць Кірша на агародзе ў той час, як усе Нізкі на вуліцы, бо ўсім не да хатніх спраў.

Увечары Галена на Кіршавым гародзе ў гарбузох знайшла абрэз. Было відно, месячна. Галена пакруціла, пакруціла абрэз у руцэ... Падзівілася. Навошта хавала абрэз Кірша. Чый ён і навошта Кіршы.

А... Галена здагадалася. Кірша, значыць, прымала ўдзел у шкодніцтве супроць акупантаў. Мо'-Павал і не кахае Кіршы, а па справах гутарыў часта з ёю. А Галена падказала яго злавіць. Што, як зловяць Паўла ў гарадзе і хутка расстраляюць. А час такі небясьпечны. Бедната апошнія дні нешта павесялела, а ксёндз чамусьці ўгаворваў Галену з бацькамі ехаць у Варшава. Пакуль і Галена зьезьдзіць у мястэчка, папросіць камэнданта, мо ўжо будзе позна і Паўла расстраляюць. Зноў кахала, ужо ня помсьцілася Галена. Бязьмерны жаль ахапіў яе.

Галена пабегла да Кіршы. Каклікала яе на ганак. Усё сказала.

Кірша шырока расчыніла вочы. Цяжка дыхалі ў роспачы грудзі. О, як ненавідзела яна Галену—гэту сытую, абутую шляхцянку.

— Ты? Гэта ты зрабіла? Каханага, дарагога выдала на пакуту, на сьмерць. А другія-ж чым вінны? А ўся вёска? У васжа нічога не ўзялі (дзіва, усё мястэчка чыноўнае за вас), а ўсіх абрабавалі.

Чорныя іскрынкі з вачэй Кіршы калолі сэрца Галены, аблівалі холадам яе твар. Галена плакала, прасіла Кіршу дараваць і дапамагчы ёй знайсьці ў горадзе Паўла.

— Мусіць, ты яшчэ ня ведаеш каханьня, Кірша. Я-ж страціла

Вось тут і палажу...

розум ад зайздрасьці. Даруй, выдай мяне чырвоным, калі яны прыдуць. Хай прыкончаць мае жыцьцё, калі я ня ўбачу Паўла.

— Ідзі Галена, ідзі ад мяне. Мы—чужыя. Вось табе шкода аднаго Паўла, а ўсіх абабраных Нізкоў, усіх змучаных беларускіх вёсак табе ня шкода. Усё жыцьцё ты прывыкла думаць аб сабе, аб сваіх уцехах, аб жыцьці ў тваім доме. А Паўла, вядома, я буду шукаць. Я знайду яго не для сябе. Я не кахаю яго, як ты Галена. Але такіх, як Павал, нам трэба шмат. Ён куды даражэйшы, Галена, „босай камандзе", чым табе.

Разьбітая, панурая Галена пашла дамоў. Першы раз у жыцьці яна была бедная і няшчасная.

Што гэта? Ці ў ваччу Галены здань. Нейкі бляск. Скаланулася Галена.

Усё неба за Нізкамі было бліскучымі чорнымі іскрынкамі ў вачох, быццам прасіла Кірша сьлесара ўзяць яе з сабою.

— Солім... Ладна, ведаю, што Солім... А калі заб'юць цябе. Маладая...

Уваччу Мурэйкі адбіўся сум. Раптам сьлесар пацалаваў Кіршу ў курчавыя чорныя валасы, з якіх хустка, як заўсёды, спаўзла назад.

— Хадзем. Сы ведаеш, мы падзяліліся. Івашка, Юзік, Чайся за горадам. Мы—я. Лявон, ты—за складам пры выезьдзе з гораду. Глядзіз-ж не палохайся. А „кастылі" ты добра выкручваеш...

— А дзе-ж наган?

Кірша паказала на кофту на грудзёх.

Белапалякі адступалі.

Па дарозе яны сустракалі папсаваную чыгунку, паламаныя, або з падложаным пад іх дынамітам масты, стрэлы з-за вуглоў, платоў, цэлыя арганізаваныя засады партызан.

Не ў ваенным стратэгічным парадку, а ў бязглуздым дзікім

Незабыўны ў памяці жудасны, страшэнны малюнак.

Гарыць сэрца Беларусі—сталіца беларускай краіны. Гарыць ад сьпякоты пажараў, бэнзынавага агню. Гарыць ад ран расстрэляных змагароў ад стогну палітвязьняў у падпаленай турме.

Агонь, пыл, пах пораху, гарох кулямётаў—зьліліся ў бязглуздую музыку шалёнага скоку.

У Кіршы нага ў крыві. Зьбіла „босая каманда" аб камень пальцы. На галаве хустку зачапіла шалёная куля.

— А дзе Павал?—сустрэў Мурэйка Кіршу.

Кірша коратка апавядала аб апошніх днёх Нізкоў.

— Ня прыходзіў да мяне. Мусіць, такі „злапалі" праклятыя. Добры хлопец Павал... Наш хлопец... А я чакаў цябе. Кірша. Дзе-ж абрэз?

Кірша распіхнула паліто, падала абрэз,

— Гэта Лявону — сказаў Мурэйка, правяраючы зборку зброі. —А ты?

— Я...з нагана. Я ўмею... Мяне Солім навучыў—нясьмела, з бліскучымі чорнымі іскрынкамі ў вачох, быццам прасіла Кірша сьлесара ўзяць яе з сабою.

— Солім... Ладна, ведаю, што Солім... А калі заб'юць цябе. Маладая...

Уваччу Мурэйкі адбіўся сум. Раптам сьлесар пацалаваў Кіршу ў курчавыя чорныя валасы, з якіх хустка, як заўсёды, спаўзла назад.

— Хадзем. Сы ведаеш, мы падзяліліся. Івашка, Юзік, Чайся за горадам. Мы—я. Лявон, ты—за складам пры выезьдзе з гораду. Глядзіз-ж не палохайся. А „кастылі" ты добра выкручваеш...

— А дзе-ж наган?

Кірша паказала на кофту на грудзёх.

Белапалякі адступалі.

Па дарозе яны сустракалі папсаваную чыгунку, паламаныя, або з падложаным пад іх дынамітам масты, стрэлы з-за вуглоў, платоў, цэлыя арганізаваныя засады партызан.

Не ў ваенным стратэгічным парадку, а ў бязглуздым дзікім

уцёку адступала белапольская армія—у шэрым натоўпе зьмяшаліся далікатныя паручнікі з простымі жаўнерамі.

Прападалі самі, а помсьціліся белапалякі, помсьціліся, як дзікуны, бязьвінным, бяззбройным жыхаром, іх дзецям. Ні адзін чалавек у горадзе і ў вёсцы ня спаў у гэту ноч. Малыя дзеці, галодныя, напалоханыя пажарамі і забойствамі—не адрывалі рук ад матчыных сукенак, стагналі і жудасна крычалі ў цяжкім змораным сьне.

Лопнулі ўзарваныя чыгуначныя масты. Іх стогн сыгналам пранёсься па стомленым горадзе.

Заціхалі стрэлы. Аддаліўся гул гарматаў. Заціхаў боль гораду. Настала доўгачаканая, няўміручая ў гісторыі хвіліна—у горад увайшлі **чырвоныя**.

Твары змораныя. Абадранае аддзеньне. Ледзь пераступаюць, стомленыя, намульныя доўгай хадой ногі.

— Мы сьпяшаліся. Мы ведалі, што ў вас тут робіцца, і заданьне выканалі раней.

— Хай жыве Чырвоная армія—грымелі галасы ва ўсіх куточках Беларусі.



Галена знайшла Паўла расстраленага белапалякамі ў местачковым лесе.

Так вызвалілася Беларусь ад прыгнечаньна і ўціску. Чырвоная армія — адзіная ў сьвеце армія супроць уціску капіталу, за зямлю, за волю, за ўладу пралетарыяту.

А Галена знайшла Паўла расстралянага белапалякамі ў местачковым лесе. Сярод іншых пяцёх пазнала яго па ружовай кашулі.

Беларусь аднавілася. Гаіліся раны ад варожай рукі. Лажыліся новыя масты. Будаваліся шырокія дарогі. Узьняліся гмахі новых фабрык і заводаў. Шырыліся далі камун і калгасаў.

Жыць бы ды жыць—як жадалася Кіршы.

Але вось што чытае Кірша сёньня ў газэце:

„Капіталістычныя краіны вядуць шалёную падрыхтоўку да нападу на Савецкі Саюз, каб зьнішчыць бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту"...

Трэба зноў рыхтавацца бараніць саветы.

Чаго-ж Кірша—сьлесар і сама ўжо зробіць „лапу", каб выняць „кастылі". Кірша напамяць ведае, як карыстацца бомбай, процігазам. Ведае Кірша баявыя сыгналы. Па адным з іх яна, самастойная савецкая грамадзянка добраахвотна, арганізаваным, ведаючым справу байцом далучыцца да старэйшага брата—Чырвонай арміі. Недарма Кірша—актыўны член ячэйкі Асоавіяхіму.

Не за капітаа, багатых прыгнятальнікаў—за саветы, за ўладу пралетарыяту пойдзе армія, у якой будзе Кірша.

Вось якая яна Кірша—былая „босая каманда".

У адказ на тэрор у Польшчы

У адказ на шалёны белы тэрор у фашысцкай Польшчы мы работніцы саўгасу „Высокая", Клімавіцкага раёну, адказваем **арганізацыяй суботніка па першапачатковай апрацоўцы ільну і арганізацыяй чырвонага абозу з ільнавалакном. Сабраныя грошы ў суме 81 руб. перадаем у карысьць палітзьняволеных. Усе, як адна, уступаем у рады МОПР'у, а таксама ўзмоцнім працу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.**

Мы супроць кулацкіх каляд, мы за лепшую падрыхтоўку правядзеньня 3-яй бальшавіцкай вясны.

Па даручэньні сходу падпісалі:
Тур, Кавалёва, Шаталава.

Жанчыны—ў рады Асоавіяхіму

У 9-й брыгадзе калгасу „Полымя" (Заслаўскі раён) арганізавалася ячэйка Асоавіяхіму Заняткі наладжаны рэгулярна. У складзе ячэйкі ёсьць і жанчыны. Калі кіраўнік гуртка зварачаецца да іх з запыганьнем, то яны саромяюцца і ўцякаюць. Трэба прыўленьню калгасу і парт'ячэйцы разгарнуць масавую работу сярод жанчын, каб больш уцягнуць іх у працу. **Лёша Дразловіч.**

Пераноска атручанага.
Атрад Асоавіяхіму ф-кі імя Крупскай (г. Менск).

Няхай жыве магутная Чырвоная армія—страж сацыялістычнай бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету!

Падрыхтуем гароды да 3-й бальшавіцкай вясны

У наступную веснавую пасеўную кампанію гародныя калгасныя таварныя фэрмы павінны аргавізавана выступіць на палі і ўсе важнейшыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да вясны выканаць у адпаведныя тэрміны.

Неабходна сваячасова вылучыць зямельныя вучасткі, якія будуць адводзіцца пад гароды, бульбу, ягаднікі, выхавальнікі і г. д.

На падставе заключаных дагавароў і атрыманых у парадку заданьняў кантрольных лічбаў па пасеве і пасадцы гародных культур—таварныя фэрмы павінны разгарнуць работу па складаньні гадавых вытворчых плянаў, а таксама рабочых плянаў на падрыхтоўчы пэрыяд да вясны. Гэтыя пляны павінны быць сваячасова прапрацаваны і абгавораны як на вытворчых нарадах фэрм, так і на агульных сходах калгасаў, з давядзеньнем рабочых заданьняў да кожнай асобнай брыгады, да кожнага асобнага калгасьніка і калгасьніцы.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на забесьпячэньне гародных таварных фэрм і калгасаў **насеньнем і пасадачным матар'ялам.** У адпаведнасьці з плошчамі пасеву і пасадкі трэба дасканала падлічыць, колькі патрэбна насеньня і пасадачнага матар'ялу, з улікам страхоўкі, а таксама прыняць усе захады да іх збору і загатоўкі.

Трэба ўлічыць наяўнасьць патрэбнага **сельскагаспадарчага інвэнтару** і арганізаваць яго сваячасовы **рамонт** з тым, каб за месяц да пачатку работы ўвесь інвэнтар быў адрамантаваны і праверaны.

Асноўнымі работамі зараз зьяўляюцца парніковыя і падрыхтоўчыя работы да веснавой пасеўнай і пасадачнай кампаніі.

Парніковыя работы. У парніковых гаспадарках за 12 дзён да пасеву **набіваюць** парнікі гарачым гноем, а пры яго адсутнасьці—другімі відамі гною. Гной загатаўляецца ў пачатку зімы—яго ўкладваюць у штабелі. Пад адну раму раньніх парнікоў ідзе 0,8 тоны, а для сярэдніх і позьніх парнікоў—0,5 тоны гною. Пры набіўцы гной перамешваецца, дробна ператрушваецца, а мёрзлыя камякі і перагарэўшы гной адкідваюцца. Пры раньняй набіўцы парніка гной трэба класьці больш рыхла, чым пры позьняй набіўцы.



Свіньні з калгасу „Новае жыцьцё", Старобінскі раён.

Праз некалькі дзён гной асядае, і трэба дадаваць у парнік гарачага гною.

Лепшай зямлёй для парнікоў зьяўляецца перагноеная дзернавая зямля, а пры адсутнасьці—добрая гародняя з прымешкай 40-60 проц. гною. Зямлю трэба прасяваць праз густы грохат і насыпаць роўным пластом у 10-18 *см*, у залежнасьці ад культуры.

Дзярна загатаўляецца шляхам здыманьня пласта ў 5-6 *см* з сухога кліну, які быў густа зарослым добрымі травамі. Дзярну, прыгатаваную з такой зямлі, трэба зьмяшаць з пяском (6 частак дзярны і 1 частка пяску).

Пасеў робіцца ў вямлю, якая нагрэлася да 20.30 градусаў.

Насеньне перад пасевам трэба намочваць (апрача радысы, капусты і інш. гладкага насеньня).

Для расады сеюць радковым спосабам у бараздёнкі. Для гародніны ўжываецца радковы, або раскіданы пасеў. Насеньне засыпаюць, прыкладна, на яго таўшчыню.

Пад раму высяваюць: **капусты раньняй**—5 грам, **цьвятной**—2,5 гр., **салаты**—4 гр., **тамату, баклажан**—7 гр., **гуркоў**—3-5 гр. (з пікіроўкай), **пятрушкі і морквы**—5 гр., **укропу**—20 гр., **радысы**—5 гр., **шпінату**—2 гр.

Пікіроўку расады трэба рабіць да зьяўленьня сапраўднага лісту—для тамагаў праз 16—20 дзён пасьля пасеву, а для капусты і гуркоў—праз 14-15 дзён.

Нармальная тэмпэратура для гуркоў—15-25° (па Цэльсію). Расаду трэба пікіраваць да зьяўленьня сапраўднага лісту, а высаджваць—пры 4-5 лісткох. Пэрыяд росту—60-70 дзён. Радыса патрэбуе 12-15° цяпла, добрай вэнтыляцыі і павышанай вільготнасьці. Пэрыяд росту—3-5 тыдняў. Салат вырашчваецца з расады на працягу 3 5 тыдняў. Расаду высаджваюць, калі будзе 4 лісточкі. Паліваць трэба ўмеркавана. Пэрыяд росту—50-70 дзён. Цяплыня для цыбулі павінна быць умеркаваная. Працяг росту—4-5 тыдняў.

Работы на грунтовым гародніцтве. Асноўная работа зараз—**нагляд за насеньнікамі ў хавальніках.** У склепах трэба захоўваць раўнамернае нізкае цяпло, але ня ніжэй 3 градусаў (Ц.). Для гэтага трэба карыстацца вэнтыляцыяй. Ацяпляць склепы печкамі ня варта.

Вэнтыляцыю трэба рабіць часта раніцою і ўвечары. Праветрываць у цёплы час і ў моцныя марозы ня варта.

Насеньнікі трэба сыстэматычна аглядаць. Калі заўважыцца псаваньне ад загніваньня, трэба не-

адкладна зрабіць пераборку і зьнішчаць хворыя экзэмпляры.

Каб насеньнікі несваячасова не прарасьлі, трэба ў тых памяшканьнях, дзе гэтыя насеньнікі ляжаць, захоўваць **цяплыню.**

Каб унікнуць ажогаў—качарыжкі капусты, трэба за адзін тыдзень да высадкі прывучаць яе да сьвятла. Для гэтага качарыжкі кладуць у скрынкі, перасыпаюць карэньні мяккай зямлёй, прыкрываюць саломай, матамі, рагожамі выстаўляюць у цяньку на дзеннае сьвятло. Штодзенна трэба памяншаць час закрываньня качарыжак шляхам паступовага зьніманьня саломы, рагож і г. д.

Пры хаваньні насеньнікаў у буртох і ямах пласт-саломы, зямлі і г. д. павінен быць дастатковым для таго, каб захаваць насеньнікі ад дажджу і сонца. Пры моцных марозах і невялікім сьнегу бурт трэба ацяпляць, насыпаючы гной, салому, лісьця і г. д. У буртох для кораньплодаў павінна быць цяпло—3-4° Ц., а для капусты—1-1½°.

Павышэньне цяпла да 7-9 градусаў у буртох і ямах паказвае тое што там пачалося гніеньцё. Такія бурты неабходна разьбіраць.

Пасеўная плошча гародніны павінна быць поўнасьцю забясьпечана насеньнем, галоўным чынам, за лік сваіх унутраных рэсурсаў. На нехапаючае насеньне павінна быць сваячасова зроблена заяўка ў райкалгассаюз.

Не пазьней, як за 10-20 дзён да пасеву, павінна быць скончана ачыстка і сартаваньне насеньня. Насеньне ўсіх культур (апрача дробнага—радыса, капусты, бручкі, салата) можна сартаваць на сартоўцы „Грыўшб", якая мае прадукцыйнасьць каля 35 цэнтнэраў у дзень.

Не пазьней, як за 10 дзён да пасеву неабходна зрабіць праверку насеньня па ўсхожасьці. Для гэтага з кожнай аднастайнай партыі насеньня бярэцца з розных месц 3-4 пробы, прычым з кожнай адлічваецца па 100 штук насеньня, якое раскладваецца ў адзін пласт на прапускной паперы, або на тонкім палатне. Папера, або палатно кладуцца ў талерку, а куткі (1-ай і 2-ой) апускаюцца ў ваду. У памяшканьні павінна быць 15-20 градусаў цяпла.

Тое насеньне, якое за час прарошчваньня толькі набухла, або заплесьнявела, зьяўляецца нягодным.

Каб пазнаць процант усхожасьці, трэба падлічыць праслае насеньне. Пры нізкай усхожасьці насеньня трэба адпаведным чынам павялічваць норму высеву гэтага насеньня. **Усю наяўнасьць насеньня трэба выкарыстаць поўнасьцю, нават і пры вельмі нізкай яго ўсхожасьці.**

Тыя плошчы, якія намячаюцца пад пасевы гародніны, павінны быць **угноены.** Для гэтага **трэба ў першую чаргу выкарыстаць мясцовыя угнаеньні**—гной, торф, кампост, попел і г. д.

Гной трэба вывозіць у кучы на поле ча працягу ўсёй зімы, з разьліку 70-80 тон на 1 гэкт.

Попел трэба зьбіраць на працягу ўсёй зімы і хаваць яго ў сухім выглядзе. На 1 *га* высяваецца 8-10 цэнт. попелу.

Норма ўнясеньня мінэральных угнаеньняў залежыць ад глебы і культуры. Для ўнясеньня мінэральных угнаеньняў на вялікія плошчы прымяняюцца тукавы сяўнік тыпу „Вэстфалія", які мае прадукцыйнасьць у 1 дзень 8-10 *га* (пры коннай цязе).

Для правядзеньня ўсіх пералічаных работ неабходна ўсю рабочую сілу калгасьнікаў, прымацаваных да работ па гародніцтве, разьбіць на пэўную колькасьць брыгад, якія атрымліваюць адпаведнае вытворчае заданьне, прымацоўваюцца да пэўных вучасткаў работы (напрыклад, на парнікох—выганцы расады і гародніны—кожная брыгада працуе на пэўных парнікох з пачатку і да канца работы). **Брыгадная арганізацыя працы поўнасьцю сябе апраўдала.** Яна прышчапляе калектыўныя навыкі працы, дае магчымасьць шырока ўжываць зьдзельшчыну, сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Усе работы павінны праводзіцца на пачатках зьдзельшчыны. **Барацьба за зьдзельшчыну—ёеьць барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.**

К.

Насеньне гніе

У калгасе „Авангард", Асьвейскага раёну, дрэнна захавалі насеньне. Ільнасемя і гарох ссыпалі сырым і яно папрэла і пачало гніць.

Турнэпс у колькасьці 300 пудоў згніў, бо дрэнна быў захаваны.

Дэлегаткі-калгасьніцы з восені ўказвалі на дрэннае захаваньне турнэпсу, але праўленьне не зьвярнула на гэта ўвагі і наогул праўленьне зусім ня прыцягвае жанчын да актыўнага ўдзелу ў працы па кіраўніцтве працай калгасу.

Праца лепшых калгасьніц у гэтым калгасе нічым не адзначаецца. **Для прэміяваньня лепшых ударніц па апрацоўцы ільну былі вызначаны прамтавары, але праўленьне калгасу разьдзяліла ўсім пароўні, хто працаваў па апрацоўцы ільну.** Такое прэміяваньне ня толькі не заахвочвае, але адбівае ахвоту да працы.

Бараноўская.

КАЛГАСЬНІЦЫ, ПРАВЕРЦЕ, ЯК ЗАХОЎВАЮЦЦА Ў ВАШЫМ КАЛГАСЕ НАСЕННЫЯ ФОНДЫ, НЕ ДАПУСКАЙЦЕ ІХ РАЗБАЗАРВАНЬНЯ

Цана асобнага нумару 10 кап.

313

Парады доктара

Кармленьне грудного дзіцяці

Кармленьне дзіцяці грудзьмі ёсьць найлепшы шлях выкарміць здаровае дзіця. Замяніць грудное кармленьне, нават найлепшымі штучнымі сумесямі рызыкоўна для здароўя дзіцяці. Усе мэтады штучнага кармленьня даюць у шмат раз горшыя вынікі, чым грудное кармленьне. Калі дзіця рана траціць грудное малако, гэта дрэнна ўплывае на яго здароўе.

Першы раз прыкладваюць нованароджанага да грудзей праз 12-20 гадзін пасьля нараджэньня, і пасьля пачынаюць карміць праз 3 гадзіны, бо страўнік дзіцяці вызваляецца ад уведзенай порцыі грудного малака праз 2½—3 гадзіны.

Двухмесячнае дзіця кормяць праз 3½ гадзіны, а пасьля праз 4 гадз. Уночы трэба рабіць перапынак на 6—8 гадзін, бо маці і дзіця патрабуюць начнога адпачынку. Кармленьне грудзьмі кожны раз павінна цягнуцца каля 15-20 хвілін. Больш 20 хвілін карміць дзіця ня варта, бо доўгае кармленьне не дае дзіцяці лішняга малака, але затое стамляе як яго самога, так і маці.

Вучні адпачываюць у пакоі адпачынку арганізаваным пры школе

Калі дзіця крычыць—гэта яшчэ ня значыць, што яно галоднае: плач дзіцяці хутчэй прымушае думаць пра якую-небудзь хваробу яго.

Грудзі пры кармленьні кожны раз мяняюць, гэта спрыяе іх лепшаму апаражненьню, што гарантуе дастатковае і доўгае выдзяленьне грудного малака. Калі ў маткі мала малака, што бывае ня так ужо рэдка, у першыя дні пасьля родаў, а часамі ў далейшым пэрыядзе кармленьня грудзьмі, дзіця не адлучаюць ад грудзей, а, наадварот, яшчэ больш акуратна прыкладваюць да грудзей, **бо толькі рэгулярнае і поўнае апаражненьне грудзей можа павесьці да павялічэньня прадукцыі грудной залозы.**

Прыкорм грудному дзіцяці ў першы раз прызначаецца каля 5—6 месяцаў. Колькасьць прыкорму паступова ўсё павялічваюць, і праз 3—4 тыдні замяняюць адно з кармленьняў грудзьмі цалкам прыкормам.

Як прыкорм, рэкамэндуецца суп, або манная каша, сухары, аўсянка і г. д. Праз некалькі тыдняў замяняюць другое кармленьне грудзьмі тым-жа або малаком з цукрам і г. д. Трэба ведаць, што кожны новы від жыўнасьці ўводзіцца паступова, пачынаючы з невялікай колькасьці. Кісель даюць дзіцяці ў 6—7 месяцаў.

Дзіця трэба карміць грудзьмі каля году, а ў летні час можна і больш, каб унікнуць захворваньня на летні панос. Звыш 9 месяцаў дзіця атрымлівае таксама пюрэ з гародніны. Сьвежыя фруктовыя або гароднія сокі пачынаюць даваць ва ўзросьце каля 4-х месяцаў.

Д-р. Альшванг.

„Работніца і калгасьніца Беларусі"—у масы

Агульны сход жонак вайсковых у горадзе Быхаве прыняў выклік калгасьніц з калгасу „Рэвалюцыя" на гадавую падпіску на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі". Сход вылучыў брыгаду для правядзеньня падпіскі. Пастанавілі зрабіць падворны абыход тых, якія ня былі на сходзе.

А. Кілеса.

* * *

Калгасьніцы Маша **Пузырэўская** і **Прыклад** К. з калгасу імя Сталіна, Крычаўскага раёну, абвясьцілі сябе ўдарніцамі па распаўсюджаньні часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" і завербавалі 45 жанчын.

Навербаваў 76 гадавых падпісчыкаў

У Кручанскім сельсавеце, Талачынскага раёну, разгарнулася падпіска на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі". У калгасе „III-ці Інтэрнацыянал" ужо завербавана 76 гадавых падпісчыкаў.

Я, грамадзкі зборшчык падпіскі на часопісь, уключыўся ў конкурс, абвешчаны рэдакцыяй і Саюздрукам. Я даю абяцаньне завербаваць 100 гадавых падпісчыкаў.

Падпіска па сельсавеце працягваецца ва ўсіх калгасах.

Выклікаю пасьледаваць майму прыкладу ўсіх рабкорак і калгаскорак часопісі.

Гдаля Трапэр.

Выданьне ЦК КП(б)Б. Рэдактар Э. ШАПІРА.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 344 У ліку 8.200 экз. Уп. Галоўлітбелу А—№ 4